Пролетары ўсіх краін, яднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 5 (461) | Нядзеля, 11 лютага 1940 года | Цана 20 кап.



Да XXII гадавіны РСЧА і ВМФ.
Малюнак В. Баркова і В. Лісевіча. Фота-клішэ ТАСС.

ЗА АКТЫЎНЫ УДЗЕЛ У ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

24 сакавіка—урачысты дзень. У гэты дзень з магутнай сілай выкажа сваю любоў і адданасць социялістычнай радзіме, вялікаму Сталіну народ, які два дзесяцігоддзі быў у панскім ярме, быў прыгнечаны і паднявolены. Ён пашле сваіх дэпутатаў—дэпутатаў гарадоў і вёсак Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай, Пінскай абласцей—у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Выбарчая кампанія ў разгары. Разгарнулі работу выбарчыя камісіі. Тысячы агітатараў нясуць у масы агністае слова большэвіцкай праўды. Новымі бліскучымі ўзорамі творчасці і працы сустракае выбары народ заходніх абласцей рэспублікі.

Вызвалена праца. І яна творыць цуды. Множацца рады ўдарнікаў, растуць рады стаханаўцаў на прадпрыемствах заходніх абласцей. З уздымам рыхтуюцца сяляне да першай сяўбы на вольнай зямлі—да першай совецкай вясны.

Вызвалена творчасць. І ярчайшай дэманстрацыяй сваіх талентаў на шматлікіх мастацкіх алімпіядах адзначае народ падрыхтоўку да выбараў. Для выбаршчыкаў, для свайго народа працуюць мастакі, афармляючы выбарчыя ўчасткі, пішучы карціны, панно, плакаты аб шчасці вызваленага народа, аб радасці жыць у братняй сям'і народаў социялістычнай краіны. У творах, сагрэтых шчырай любоўю да вялікай радзімы, услаўляюць Сталінскую Канстытуцыю паэты і пісьменнікі разняволенай зямлі.

24 сакавіка—радасны дзень для ўсяго з'яднанага вялікага беларускага народа. Дастойна спаткаць гэты дзень — значыць прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да выбараў.

Союз совецкіх пісьменнікаў БССР, работнікі мастацтваў рэспублікі маюць багаты палітычны і творчы вопыт удзелу ў выбарчых кампаніях. Яго трэба выкарыстаць зараз, даўшы новыя ўзоры большэвіцкай агітацыйна-масавай, прапагандысцкай, палітычнай работы сярод выбаршчыкаў заходніх абласцей.

Што могуць і павінны зрабіць пісьменнікі Совецкай Беларусі?

Зброяй мастацкага слова—песнямі, вершам, нарысам—змагацца за большэвіцкі поспех правядзення выбараў, за аднагалоснае выбранне кандыдатаў, выстаўленых партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі, таварыствамі працоўных, сялянскімі сходамі.

Расказаць выбаршчыкам аб самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі, аб вялікіх правах і пачэсных абавязках грамадзяніна социялістычнай краіны. Паказаць, як будуецца новае шчаслівае жыццё там, дзе так нядаўна панавала беспрацоўе, беззямелле, прыгнёт. Расказаць аб кандыдатах у дэпутаты—лепшых, актыўнейшых будаўніках новага жыцця. І сілай большэвіцкага слова бязлітасна біць варожую агентуру, узнімаць рэволюцыйную пільнасць працоўных.

Для гэтага павінны быць выкарыстаны ўсе сродкі—і ўдзел у друку, і выступленні пісьменнікаў на прадпрыемствах, у вёсках—на выбарчых участках.

Вопыт работы сярод выбаршчыкаў, які маюць нашы пісьменнікі, павінен стаць здабыткам літаратурных сіл заходніх абласцей рэспублікі. Пісьменнікі Беластока, Вілейкі, Пінска, усіх заходніх абласцей павінны быць прыцягнуты да вырашэння сваёй творчасцю пачэсных задач большэвіцкай прапаганды ў часе выбарчай кампаніі. Выдатнай школай палітычнай загартоўкі і крыніцай творчага ўзбагачэння з'явіцца для кожнага пісьменніка заходніх абласцей удзел ва ўсенароднай патрыхтоўцы да выбараў на аснове Сталінскай Канстытуцыі.

З новым уздымам павінны працягваць свае слаўныя традыцыі абслугоўвання выбаршчыкаў і работнікі мастацтваў Совецкай Беларусі. І ў гэтай галіне павінны шмат зрабіць маладыя калектывы работнікаў мастацтваў заходніх абласцей, — акторы, музыканты, мастакі, якім Сталінская Канстытуцыя адкрыла сонечны шлях шчаслівай творчасці на карысць свайго народа.

Жыватворчыя прамені Сталінскай Канстытуцыі саграваюць зямлю, з якой змецена чорная ноч панскага ўладарання. Як кашмарны сон успамінаецца ганебныя выбараў у панскі сейм—дні жахлівых здзекаў з працоўных.

Свабодны народ—гаспадар сваёй зямлі і свайго лёсу—выкажа сваю волю. Ён пашле ў вярхоўныя органы ўлады сваіх любімых сыноў і дачок, якія здолеюць апраўдаць яго спадзяванні і давер'е, будуць пабеданосна несці ўперад сцяг вялікай партыі Леніна і Сталіна. І новай урачыстасцю маральна-палітычнага адзінства совецкага народа, соцыялістычнага дэмакратызма, ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі будзе адзначан дзень выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР ад заходніх абласцей рэспублікі.

Большэвіцкай, страснай і натхнёнай работай па выхаванню ў соцыялістычным духу новых грамадзян нашай радзімы, актыўным удзелам у выбарчай кампаніі сустрэнем радасны дзень 24 сакавіка!

20 ГОД СОВЕЦКАЙ КІНЕМАТАГРАФІІ

Совецкай кінематаграфіі — 20 год. У гісторыі развіцця мастацтва перыяд у 20 год амаль нікчэмны, але 20 год развіцця ва ўмовах соцыялістычнай краіны—гэта вялікі шлях творчага выспявання.

Рускае дарэволюцыйнае кіно таксама налічвала каля двух дзесяцігоддзяў, але хіба можна хаця ў якой-небудзь меры параўноўваць вынікі гэтых зусім розных перыядаў? Хіба падобны былі саматужныя кінематаграфічныя атэлье Ханжонкава, Дранкова, Ермольева на сёнешнія гіганты кіновытворчасці—Мосфільм, Ленфільм, Кіеўскую і Тбіліскую студыі? А што агульнага мела бездапаможная і бяздарная стрэпніна, называемая рускімі кінокарцінамі, з совецкімі фільмамі, якія прайшлі пераможным маршам па ўсіх экранах свету?

27 жніўня 1919 года Соўнаркам РСФСР выдаў за подпісам В. І. Леніна дэкрэт аб нацыяналізацыі кіно. Кіно стала дзяржаўнай справай. З першых-жа дзён былі сабраны ўсе наяўныя рэшткі плёнкі і ім было акрэслена строгае прызначэнне. Дораг быў кожны метр. Прадстаяла зняць непаўторныя гістарычныя падзеі. У першую чаргу, рэшткі плёнкі былі скарыстаны для здымак падзей на франтах грамадзянскай вайны і ўнутранага будаўніцтва. Можна ад душы пазайздросціць гледачам тых дзён. Яны часта маглі бачыць на экране Леніна, Сталіна, Варашылава, якія кіравалі падзеямі, бачылі Чапаева, Шчорса і слаўныя баявыя справы іх дывізій, бачылі сапраўдныя гераічныя подвігі на франтах грамадзянскай вайны, адлюстраваныя на кіноплёнцы. Усё гэта зараз захоўваецца ў спецыяльных архівах у якасці найкаштоўнейшых дакументаў гісторыі.

З першых дзён свайго жыцця маладое кіномастацтва стала баявой зброяй рэволюцыйнага народа. Яно стваралася на франтах, у агітпаездах, страсна заклікаючы гледачоў да барацьбы з унутранай і знешняй контррэволюцыяй, з разрухай. Спачатку яно гаварыла з народам голасам агітатара, голасам плакатнага лозунга. Гэта яшчэ не было тым мастацтвам, якім мы яго ведаем цяпер. Мастацкае гучанне маладое кіно набыло некалькі пазней калі клопаты праваднікоў партыі Леніна і Сталіна ўзнялі яго на адпаведную і заслужаную вышыню.

В. І. Ленін вельмі зорка і ўважліва сачыў за развіццём кіномастацтва. Будучы ў эміграцыі ў Швейцарыі, Уладзімір Ільіч часта хадзіў у тагачасны «сінематограф». І калі яшчэ ў кінематографе бачылі толькі дасціпнае тэхнічнае вынаходства; не больш, Ленін прадсказваў кінематаграфіі вялікую будучыню. Прадбачанне Леніна апраўдалася. Да апошніх дзён свайго жыцця Уладзімір Ільіч дапамагаў мацнець самаму масаваму і народнаму, як лічыў яго Ленін, мастацтву—кіно. Вядомы дырэктыўныя ўказанні Уладзіміра Ільіча Луначарскаму аб пашырэнні кіносправы ў рэспубліцы. У адной з гутарак з Луначарскім аб кіно Ленін сказаў: «Па меры таго, як вы станеце на ногі... вы павінны будзеце разгарнуць вытворчасць шырэй, а ў асаблівасці прасунуць здаровае кіно ў масы ў горадзе, а яшчэ больш таго ў вёсны».

На VIII з'ездзе партыі пад кіраўніцтвам Леніна была распрацавана першая партыйная дырэктыва аб выкарыстанні кіно, як праваднікa новай соцыялістычнай культуры і комуністычнай прапаганды. Ленін часта і настойліва рэкамендаваў здымаць навучальныя і хранікальныя фільмы, паказваючыя жыццё і быт народаў Совецкай Расіі і іншых краін. Цікавасць Леніна да кіно выходзіла не з суб'ектыўнай любві да гэтага мастацтва. Справу развіцця кіно Уладзімір Ільіч лічыў справай клопату і ўвагі ўсёй партыі.

Пытанні кіно не раз закраналіся на партыйных з'ездах. На XIV з'ездзе партыі па пытаннях кіно выступілі таварышы Сталін і Молатаў, якія гаварылі аб найвялікшых магчымасцях кіно ў справе масавай агітацыі. Толькі няўхільныя клопаты партыі дапамаглі кінематаграфіі ўмацавацца на асновах сапраўднага мастацтва і загаварыць з экрана мовай мастацкіх вобразаў. Хутка пасля XIV з'езда партыі на экраны выходзіць «Браняносец Пацёмкін» — Эйзенштэйна. «Маці» і «Канец Санкт-Пецербурга» Пудоўкіна—як адказ на рашэнне партыі аб умацаванні ідэйна-творчай якасці совецкіх карцін. З выхадам гэтых карцін на экраны адкрылася новая старонка не толькі совецкай, але і ўсёй сусветнай кінематаграфіі. Поспех гэтых карцін на сусветных экранах быў нябачаны ў гісторыі кіно.

★ К. ГУБАРЭВІЧ ★

Пасля прагляду «Браняносца Пацёмкіна» французскі кінарэжысёр Альберці Кавальканці пісаў: «Народ-пераможац павінен быў паказаць свету свае фільмы. І свет не быў ашуканы ў сваіх чаканнях. Незабыўнай з'явілася для нас дэманстрацыя ў Парыжы «Браняносца Пацёмкіна». Упершыню кіно патрасло, пакарыла масы...»

Буржуазная крытыка, якая не прызнавала нават магчымасці існавання совецкага кіно, пасля гэтых карцін аднагалосна прымушана была прызнаць, што «пачалася эпоха вялікіх совецкіх фільмаў». І ў гэтым яна была права.

На працягу першага дзесяцігоддзя лік такіх фільмаў рос досыць марудна. Маладая совецкая кінематаграфія з кожным днём наближалася да неабходнасці карэннай перабудовы. Совецкая кінематаграфія ў тэхнічных адносінах была самая адсталая. Аснова кіновытворчасці — плёнка і кіноапаратура—прывозілася з-за граніцы. І тут партыя зноў прыйшла на дапамогу кіно. За гады першай сталінскай пяцігодкі была перазброена тэхнічная база кінематаграфіі. Пачала вырабляцца свая плёнка і апаратура. Студыі былі рэканструіраваны і пабудаваны нанава. І самае галоўнае—совецкае кіно асвоіла гук. Усё гэта стала асновай далейшага нябачанага росквіту совецкага кіномастацтва.

Пачынаючы з 1930 года, на экране СССР адна за другой выйшлі карціны, якія выклікалі ў народа гарачае прызнанне і захапляючы поспех: «Пуцёўка ў жыццё», «Адна», «Златыя горы», «Пецербургская ноч», «Гроза», «Чэлюскінцы», «Тры песні аб Леніне», «Паручык Кіжэ», «Чапаеў», «Мы з Кранштата», «Дэпутат Балтыкі», «Балтыйцы» і створаныя нашымі нацыянальнымі кіностудыямі «Пепо», «Апошні маскарад», «Шчорс». Яны ўзначалілі другое дзесяцігоддзе совецкага кіно. Некаторыя з іх, як «Чапаеў», былі прыняты народам як вялікая палітычная з'ява.

Вырастае цэлая пляяда маладых талентаў. Да раду выпрабаваных майстроў, як Эйзенштэйн, Пудоўкін, Даўжэнка, Эрмлер, далучаюцца малавядомыя тагачаснаму гледачу імёны рэжысёраў: В. Пятроў, І. Рашаль, Е. Дзіган, А. Файнцымер, В. Корш, Хейфец і Зархі, Козінцаў і Трауберг, Экк, бр. Васільевы і інш.

Многія з іх удастоіліся высокіх урадавых узнагарод і званняў.

У дні пятнаццацігоддзя совецкага кіно Цэнтральны Камітэт партыі і таварыш Сталін выказалі пажаданне, каб работнікі кіно яшчэ больш глыбока і рашуча пранікалі ў рэчаіснасць. І можна з упэўненасцю сказаць, што апошнія гады работы совецкай кінематаграфіі былі сапраўды смелым творчым пранікненнем у жыццё.

Кінематаграфія па-новаму і глыбока перааданіла многія праблемы і тэмы совецкага мастацтва. Узяць для прыкладу гістарычную тэму. Толькі праз экран гэта тэма стала народным здабыткам, стала сапраўды папулярнай. Любімыя народам фільмы «Аляксандр Неўскі», «Мінін і Пажарскі», «Сцяпан Разін», «Пугачоў»—фільмы не толькі аб асобных героях, але і аб гістарычных эпохах. Тэма грамадзянскай вайны з надзвычайнай сілай прагучала ў фільмах «Чапаеў», «Мы з Кранштата», «Дэпутат Балтыкі», «Балтыйцы» і інш. Важна адзначыць і тое, што кіно змагло глыбока і прынцыпова пачаць вырашэнне важнейшай праблемы совецкага мастацтва — праблемы стварэння мастацкага вобраза Леніна і Сталіна. У гэтым пытанні кінематаграфія ідзе ўперадзе ўсіх мастацтваў.

«Сустрэчны», «Сяляне», «Лётчыкі», «Комсамольск», «Вялікі грамадзянін». «Член Урада»—прадстаўляюць сабою новы творчы пункт погляду на сучасную тэму не толькі ў кіно, але і ва ўсім мастацтве.

І, нарэшце, самае галоўнае. Кіно аказала выключна велізарны ўплыў на ўсё совецкае мастацтва ў распрацоўцы стылю соцыялістычнага рэалізма.

Глядач любіць і цэніць совецкае кіномастацтва, таму што яно сапраўды народнае, сапраўды баявое мастацтва, якое можа весці за сабою мыслі, пачуцці і імкненні народных мас.

Ніколі совецкае кіномастацтва не было-б такім масавым, калі-б яно не было шматнацыянальным. Совецкая кінематаграфія—адзіны фронт васьмі нацыянальных кіноарганізацый, з якіх беларуская кінематаграфія ледзь не самая маладая.

20-годдзе ўсёй совецкай кінематаграфіі супадае з 15-годдзем беларускай совецкай кінематаграфіі. За 15 год свайго існавання беларуская кінематаграфія выйшла ў перадавы рад нацыянальных кіноарганізацый. Беларускай кіностудыяй выпушчана звыш 50 карцін, сярод якіх «Першы ўзвод», «Паручык Кіжэ», «Шукальнікі шчасця», «Балтыйцы», «11 ліпеня», «Канцэрт Бетховена» з'явіліся дасягненнем усёй совецкай кінематаграфіі. Але ў практыцы работы беларускай кіностудыі пераважае яшчэ сярэдняя прадукцыя.

Зараз кіностудыя «Совецкая Беларусь» перазбройваецца тэхнічна. Барацьба за высокі ідэйна-творчы ўзровень беларускіх карцін становіцца зараз асновай работы студыі.

За час свайго існавання кіностудыя «Совецкая Беларусь» выхавала многіх прызнаных майстраў совецкай кінематаграфіі. Засл. дзеяч маст. Тарыч, засл. дзеяч маст. Корш, засл. арт. рэсп. Файнцымер, ордэнаносец Дзіган, аператар Наумаў-Страж, аператар засл. арт. рэсп. Кальцаты—усе яны выраслі і творча аформіліся ў беларускай студыі. За апошнія гады ў студыі падрасло другое пакаленне творчых работнікаў—рэжысёры Наўроцкі, Сплашноў, Шульман, Стальмакоў, Гезін, аператары Гарэлік, Вэавенка, Рагоўскі, Іваноў, кінодраматург Таубэ.

20-годдзе совецкага кіно творчыя работнікі беларускай студыі адзначаюць плённай творчасцю, актыўнай барацьбой за далейшы росквіт беларускага кіномастацтва.



Сёння споўнілася 65 год з дня нараджэння народнага артыста СССР ордэнаносца В. І. Качалава. **На здымках:** уверсе — **В. І. Качалаў** у сябе дома, унізе— В. І. Качалаў у чатырох момантах з «Братоў Карамазавых» Дастаеўскага: «Кашмар» — размова Івана Карамазава з чортам.

Фота-клішэ ТАСС.

НІНА ТАРАС

ВЕРШЫ

***

Спатканіся, помніш. Дарогі ў даліне
Разбегліся стужкай на захад і ўсход.
Сярэбраным восень цвіла павуціннем
На дрэвах, на мокрых прасторах балот.

Расказваў, як Волга у буру стагнала,
Як недзе у стэпах сплялася трава,
І раніцай звонкай з вяршыняў Урала
Як сыплецца золатам сонца на твар.

А потым маўчалі. Каманда: «На конях!»
Рассталіся. Захад крывёю палаў,
І згублена месяц свяціўся палковай,
Я зноў па знаёмых трапінах шагаў.

І мо', як героем ты станеш краіны,
Успомніш сярэбраны восені гар.
А я не забуду, з Урала вяршыняў
Як падала золатам сонца на твар.

***

Ужо зіма. І ветрам гнаныя
Далёка хмары адплылі, —
Мне сніцца зноў дарога знаная
Праз межы, вузкія палі.

Калісь ішла я, аглядалася,
Хавалася маё сяло,
Яно здалёку адгукалася
Знаёмай песняю без слоў.

Пастух у полі за авечкамі
Жалейку новую круціў
І, седзячы над бурнай рэчкаю,
Граў сумны восенскі матыў.

Цяпер зіма. І шлях замецены,
Не адшукаць яго ўначы,
Сумуе маці недзе вечарам,
Кудзелю тонка прадучы.

А я... хацела-б к ім ляцець душой,
Ды вецер снег і словы рве.
Другі мо' раз калісь прыпомню зноў
Далёкі восені напеў.

УБОГІ

Вось загнала снегам знаныя дарогі,
Ні агня, ні следу вокала нідзе,
Толькі адзінокі з торбаю убогі
Пракладае сцежку лапцямі у свет.
Што-ж, за хлебам можа лёганька
цягацца.
Э-хэ-хэ, жыццё ты, доўгія гады.
Прападаюць людзі цэлы век без працы,
Хто стары, а нават... і хто малады.

Вецер адзінокі латае сярмягу,
І над лесам цяжкім плача у галлі,
У душы ад жалю з новаю адвагай
Нарастае думак дзіўны пералів.

Хіба там у вёсцы, дзе сплялося гора,
Дзе дрыжыць ад сцюжы вечарам сям'я,
Вынесе батрачка лусту з-за парога,
Хоць вясной спаткае голад і сама.

Затаняе снегам знаныя дарогі,
Думкі паляцелі з ветрам у сяло.
Недзе там далёка за шырокім полем
Загарэўся ў шыбах бледны аганёк.

Вільня, 1937.

РАБОТНІКІ МАСТАЦТВАЎ—ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

7 лютага радам творчых справаздач лепшых артыстаў і канцэртных калектываў перад байцамі, камандзірамі і палітработнікамі Чырвонай Арміі пачалася дэкада мастацкага абслугоўвання работнікамі мастацтваў БССР часцей Чырвонай Арміі ў сувязі з XXII гадавінай РСЧА.

На працягу лютага каля 40 лепшых артыстаў Тэатра оперы і балета, Белдзяржтэатра, Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра, Радыёкамітэта на шматлікіх канцэртах прадэманстрыруюць перад байцамі і камандзірамі Чырвонай Арміі свае дасягненні. У справаздачных канцэртах прымуць удзел народныя артысты БССР Александроўская, Уладамірскі і Глебаў, заслужаныя артысты рэспублікі Даянісаў, Бірыла, Нікалаева, Млодэк, Балоцін, Друкер, Галіна, Васільева, Мурамцаў, Ждановіч, Аляксеева, Платонаў, Ржэцкая, Рахленка, Трэпель, Сокал, Арончык, Моін, Бяссмертны, лаўрэаты ўсесаюзных конкурсаў Лысенка, Жыновіч, Амітон, Власаў, Руч'ёва, Арсенка і інш. Усяго адбудзецца 27 творчых справаздач-канцэртаў.

З творчымі справаздачамі выступяць таксама вакальны квартэт і хор Радыёкамітэта, ансамбль песні і пляскі, хор і аркестр народных інструментаў Белдзяржфілармоніі, калектывы Белдзяржэстрады.

Творчыя справаздачы-канцэрты дадуць дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР—кампазітары А. Е. Туранкоў і А. В. Багатыроў.

На працягу лютага для часцей Чырвонай Арміі будзе дадзен рад спектакляў і канцэртаў, у якіх прымуць удзел усе тэатры БССР, калектывы Белдзяржфілармоніі, Кансерваторыі, музыкальных вучылішчаў і школ і Белдзяржэстрады. Звыш 50 спектакляў і 40 канцэртаў—вось падарунак работнікаў мастацтваў Чырвонай Арміі. Апрача таго, будзе дадзена 14 выязных спектакляў і рад канцэртаў сіламі двух выязных брыгад Белдзяржэстрады.

19 лютага адбудзецца сустрэча работнікаў мастацтваў з байцамі і камандзірамі, якія прымалі ўдзел у вызваленні працоўных Заходняй Беларусі ад панскага прыгнёту. Такія-ж сустрэчы адбудуцца на пагранзаставах і на кватэрах камандзіраў Чырвонай Арміі.

Адначасова адбудзецца рад канцэртаў чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці, якія будуць трансліравацца па радыё. 28 лютага лепшыя калектывы чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці выступяць на вечары-сустрэчы работнікаў мастацтваў з прадстаўнікамі Чырвонай Арміі.

Для заняткаў і кансультацыі з адоранымі чырвонаармейцамі-мастакамі вылучаны засл. дзеячы мастацтваў Грубе, Азгур і Волкаў, мастакі Пашкевіч, Манасзон, Зайцаў, Гаўрыленка, Дучыц і Эйдэльман.

На працягу лютага арганізуецца рад экскурсій байцоў і камандзіраў і членаў іх сямей у Карцінную галерэю БССР.

Работнікі мастацтваў БССР, у адпаведнасці са слаўнай традыцыяй, якая існуе на працягу раду год, адзначаюць XXII гадавіну Чырвонай Арміі святочнымі падарункамі часцям Чырвонай Арміі.

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР

АБ УСТАНАЎЛЕННІ ПРЭМІЙ ІМЕНІ СТАЛІНА ПА ЛІТАРАТУРЫ

У дадатак да пастановы СНК Саюза ССР ад 20 снежня 1939 года «Аб устанаўленні прэмій і стыпендый імені Сталіна» СНК Саюза ССР пастанаўляе:

Устанавіць **4 прэміі імені Сталіна**, па 100 тысяч рублёў кожная, прысуджаемыя штогод за выдатныя творы ў галіне літаратуры, з іх:

адну — па паэзіі,
адну — па прозе,
адну — па драматургіі,
адну — па літаратурнай крытыцы.

Старшыня Совета Народных Камісараў СССР
В. МОЛАТАЎ.
Кіраўнік Справамі Совета Народных Камісараў СССР
М. ХЛОМАЎ.

1 лютага 1940 года.
Масква, Крэмль.

За высокую якасць мастацкіх твораў

Пастанова ўрада СССР аб вызначэнні сталінскай прэміі за лепшыя літаратурныя творы будзе спрыяць далейшаму ўздыму літаратуры. Гэтым наша партыя і ўрад яшчэ раз падкрэслілі вялікую ўвагу да літаратуры, да пісьменніка, свае клопаты аб якасці літаратуры. За апошнія годы барацьба за якасць стала асновай усіх нашых літаратурных спрэчак, крытычных артыкулаў і грамадскіх абмеркаванняў. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў радзе новых твораў, якасна больш высокіх і мастацка больш дасканалых, чым творы ранейшых год. Пісьменнікі сталі больш вучыцца, больш глыбока вывучаць рэчаіснасць, больш упарта працаваць. Такім чынам падрыхтавана глеба для яшчэ большага росквіту літаратуры.

Сталінскія прэміі дадуць магутны размах гэтай рабоце. Сталінская прэмія можа быць прысуджана і будзе прысуджана за сапраўды выдатны твор, і да такой якасці будуць імкнуцца ўсе, хто будзе спаборнічаць на атрыманне гэтай прэміі.

М. КЛІМКОВІЧ.

АПРАЎДАЦЬ ВЫСОКАЕ ДАВЕР'Е

Як добра на зямлі такой
Тварыць,
ісці да яснай далі,
Дзе твой ахоўвае спакой
Вялікі друг — Іосіф Сталін.

У нашай краіне пісьменнік мае ўсе магчымасці для развіцця таленту, для плодатворнай работы.

Сталінская прэмія, вызначаная за лепшыя літаратурныя творы, яшчэ раз сведчыць аб сталінскіх штодзённых клопатах і ўвазе да совецкага пісьменніка.

Кожны з нас павінен пісаць значна лепш, авалодваць вышынямі літаратурнага майстэрства.

Жыццём, творчасцю мы павінны апраўдаць высокае давер'е радзімы і правадыра.

Эдзі АГНЯЦВЕТ.

М. ТАНК

ЗІМА

З паэмы „Сілаш“

Дзень цэлы плавалі вятры.
Звінела рунь, палын на межах.
Пад вечар снегам завірыў
спазніўшыйся кудлаты снежань.

На пачарнелую салому
сыпнуў сцюдзёным пухам лётным,
абвіў платы звінячым лёнам,
раскінуў белыя палотны.

На хвалі храмлючай раллі
падзьмуў з-за Сіняй Гаці сівер —
і ажылі,
і паплылі
на лес ўзмяцеленыя нівы.

Але навалу хмар цяжкіх
стрымалі, выгнуўшыся, хвоі.
Толькі па соснах залатых
ўзнялося полымя сівое.

У змрочных лапках запвіло.
з бяроз сярэбранага вецця
на сухастой, на буралом
яго панёс калючы вецер.

Збудзіўся пятраў цёмны гул,
з лагоўяў воўчых і выкопаў
папоўз па свежаму снягу
па выбітых руёю тропах.

Зіма.

Ад інею вішняк
перахіліўся за парканы.
І не мінеш яго ніяк,
кранеш — і цветам серабраным

асыпле з галавы да ног.
Не дзеннікі вароны сталам
лятуць з прасёлачных дарог.
Дзе-недзе лубіну — прынада —

сухое каліва замёў
злягка пух свежы, спаранелы
і петлі заячых слядоў
на полі іскрыстым і белым.

За гумны выйдзеш, — цішынёй
як хвалі снежныя не звоняць, —
на небасхіле паласой
чарнеюць палявыя клёны.

На іх і воблакі часамі,
змарыўшыся, адпачываюць,
і доўга, доўга вечарамі
зара гарыць, не адлятае.

Аж пакуль шчодраю рукой
сыпне ноч зоры на дарозе.
І чуеш... недзе пад дугой
маладзіка пяюць палоззі.

ГАДАВІНА З ДНЯ СМЕРЦІ ЭДУАРДА САМУЙЛЁНКА

АБ ЭДУАРДУ САМУЙЛЁНКУ

Прайшоў год з дня смерці Эдуарда Самуйлёнка і да жудасці цяжка аб гэтым думаць. Час — найлепшы доктар, але год — занадта малы час, каб залячыць смутак аб дарагім і выдатным чалавеку. І яшчэ быццам чакаеш, што прыдзе ён і са звыклай сваёй ноткай жарту, скажа:

— Здароў, стары, ну, што парабляеш? А ведаеш, каб яны гарэлі, з маёй галавы не вылазяць мае землякі. Нават адзного я сніў.

Яго «землякі» — гэта тыпы, якія ён калі-небудзь бачыў у жыцці, якія пэўнымі сваімі рысамі назаўсёды засталіся ў яго памяці. Тут былі і сапраўдныя землякі, сяляне з Полаччыны, але многа было і людзей з іншых мясцовасцей, дзе прыходзілася іх бачыць. Многа было ленінградцаў (у гэтым горадзе Эдуард Самуйлёнак жыў некалькі год у часы свайго маленства). Ён падоўгу, бывала, расказваў аб гэтых сваіх «земляках», і з выразу яго твару, і з тону слоў можна было бачыць, што да рэальных рысаў жывога чалавека, якога ён ведае, усё больш і больш дадаецца фантазіі расказчыка і... тут пачынаецца ўжо творчасць. Смешная рыса вырастае ў непамерны камізм, звычайная непрыемнасць ператвараецца ў вялікае гора. Так умеў ён рысаваць карціны людскіх спраў.

Аднойчы ён сказаў:

— Адна толькі вёска, дзе я нарадзіўся і вырас, можа даць тыпаў на поўсотню раманаў. Ты не палохайся, што гэта з адной вёскі і раманы могуць выйсці аднародныя сваім матэрыялам. Перш за ўсё, гэта чалавечыя тыпы, якія можна ставіць у розныя ўмовы і сітуацыі.

Ён насіў у сабе вялікія магчымасці, гэта быў сапраўдны талент. Гэта быў інжынер, які глядзіць на кавалак метала і думае аб тых магчымасцях, якія затоены ў гэтым кавалку. У фантазіі інжынера ўстаюць машыны і прылады, што будуць зроблены з метала. Малады пісьменнік думаў аб тых карцінах жыцця, якія ён нарысуе ў сваіх раманах.

Творчыя планы Эдуарда Самуйлёнка былі вельмі шырокія, і ў гэтых планах ён перш за ўсё быў рэалістам. Яго, напрыклад, цікавіў тып селяніна, які некалькі год упарта не хацеў ісці ў калгас, але жыў побач з калгасам, у роднай яму вёсцы, і з дня ў дзень пазіраў усё, што рабілася ў калгасе. Ён сам таго не заўважаў, што душой сваёй даўно ўжо стаў калгаснікам. Яму вельмі добра былі відны тыя непаладкі, што былі ў калгасе. Іх ён заўважаў, можа, лепш, як хто іншы. І нарэшце ён не вытрымаў. Сумленне сказала яму, што ён павінен ісці ў калгас, каб навесці там сапраўдныя парадкі. Эдуард Самуйлёнак расказваў пра гэткага чалавека, які сапраўды вельмі многа карысці прынёс калгасу. Ён гаварыў, што гэты тып, ці, як ён казаў, «гэты мой зямляк», цікавіў яго, як тып «звычайнага чалавека».

— Вось тып, на аснове якога я ствару вобраз савецкага патрыёта. Часамі чалавек быццам-бы чым-небудзь і незадаволен, нешта бурчыць сабе пад нос, а калі брыдзецца да справы, — ён выяўляецца як сапраўдны патрыёт радзімы. І за яе аддасць жыццё.

У Эдуарда Самуйлёнка гэта былі самыя першапачатковыя абрысы аднаго з тых твораў, якія ён меркаваў напісаць. Тут яшчэ не было канкрэтных раманных сітуацый, быў толькі пачатак ідэйнага замыслу, які ўзнік тады, калі пісьменнік пазнаёміўся з весцю на Полаччыне з успамянутым вышэй калгаснікам.

Аб сваіх творчых планах на самы бліжэйшы час Эдуард Самуйлёнак, незадоўга да сваёй смерці, так пісаў: «Гэты год — найбольш прадукцыйны ў маёй творчасці. У сакавіку я скончыў работу над першай кнігай рамана «Будучыня». Зараз заканчваю п'есу «Пагібель воўка», прызначаную для Дзяржаўнага драматычнага тэатра. Яшчэ ў гэтым годзе мяркую распачаць работу над сцэнарыем для кінастудыі «Савецкая Беларусь».



Э. Л. Самуйлёнак у 1931 годзе.

Але мы ўсе добра ведалі, што Эдуард меркаваў неўзабаве брацца за другую кнігу рамана «Будучыня», а пасля гэтага,— часта казаў ён, — будуць раманы, дзе будуць дзейнічаць «мае землякі». Заўчасная смерць не дала здзейсніцца гэтым планам. Раман «Будучыня» ён пісаў ужо хворым. Ён жыў тады ў Пухавічах, ён прыехаў сюды, каб, як сам казаў, «застацца аднаму з сваім раманам». Ужо тады ён вельмі хутка стамляўся і не мог падоўгу «сядзець за працай. А п'есу «Пагібель воўка» ён пісаў ужо вельмі і вельмі хворым. Ён спяшаўся чым найхутчэй давесці да канца працу над п'есай, быццам-бы адчуваючы блізкую смерць. Аднак, ён бадзёрыўся да самага канца. Звыклы яму юмар не пакідаў яго.

У яго былі планы і яшчэ на адну п'есу. Апошнімі гадамі ён усё больш і больш уваходзіў у сферу сваіх літаратурных замыслаў, — так прыйшла яго творчая спеласць і сталасць. Гэта быў талент, які многа зрабіў-бы для нашай літаратуры.

Ужо зусім хворы, ён не пакідаў працы бадай за самай смерці. І «Будучыню» і «Пагібель воўка» ён напісаў, перамагаючы хваробу. Гэта быў высокі гераізм, варты таго, каб яму наследаваць.

У жыцці ён цікавіўся ўсім. Запас ведаў у яго быў вялікі. Як сапраўдны знаўца рэчаў, ён мог гаварыць і аб раслінах, і аб звярах, і аб гатунках глебы, і аб мінулых гістарычных падзеях, і аб якасцях тканін. Прыроду ён любіў вельмі моцна. Перад вакном яго кватэры расло некалькі маладых садовых дрэў. Яго заўсёды радавалі гэты кавалачак прыроды ў горадзе. Ён любіў расказваць аб прыродзе Полаччыны — мясцовасці, дзе ён нарадзіўся і вырас. Адчуванне хараства прыроды клала свой след і на яго творчасць. Цудоўнае яго апавяданне «Паляўнічае шчасце» напісана з такім адчуваннем прыроды, што ўсё яно гучыць, як музыка зімы ў полі і ў лесе. Успомнім ноч, снег і лес, калі герой апавядання начуе ў лесе, каб злавіць звера.

Вялікае замілаванне да «простых савецкіх людзей» гучыць ва ўсёй яго творчасці. З якой шчырасцю ён выпісваў вобразы калгаснікаў у сваіх апавяданнях і ў п'есе «Пагібель воўка»! Чалавек чыстага сумлення і высокай прынцыповасці — вось якім рысуецца мне вобраз Эдуарда Самуйлёнка — савецкага грамадзяніна, пісьменніка.

Светлая памяць аб табе, дарагі і любы Эдуард, ніколі не згасне ў сэрцы!

КУЗЬМА ЧОРНЫ.

ПЕРШАЯ СУСТРЭЧА

У 1930 годзе, здаецца, у верасні, ў рэдакцыю газеты «Чырвоная Полаччына» зайшоў высокі чалавек у чырвонаармейскім шынелі. У руках у яго быў невялікі стары партфель. Прывітаўшыся, ён уважліва агледзеў вясёлымі вачыма работнікаў рэдакцыі.

—Калі не памыляюся, вы будзеце Астрэйка?—запытаўся ён у мяне —Я аднойчы слухаў ваша выступленне на літаратурным вечары ў Доме асветы. Вы цяпер сакратар літаратурнай секцыі?—пачаў гутарку чырвонаармеец —Я прынёс верш «Смерць партызана».—Ён выняў з партфеля два лісты паперы. Прамымі літарамі быў напісан верш. Мяне здзівіла акуратнасць почарка—літара ў літару, нібы гэты чалавек скончыў нейкія курсы каліграфіі. Спадабаўся мне і верш. Ён быў напісан ад сэрца, кожны радок і вобраз быў сагрэт паэтычнай цеплынёй. Але я тады не асабліва, па праўдзе кажучы, разбіраўся ў вершах. Калі рытм быў роўны і рыфма была на месцы, дык я лічыў верш добрым.

Але, як ні крыўдна аб гэтым зараз успамінаць, мяне прывабіў да сябе не верш, а почарк. Са старшым майстрам наборнага цэха друкарні з-за почарка выходзілі штодзённа скандалы. У рэдакцыі тады машыністкі не было.

— Пісаць не ўмееце, як курыца нарапаеце. Не прымаю ў друк такіх арыгіналаў!—крычаў майстар. А тут сапраўдны скарб. У чалавека такі зразумелы і акуратны почарк!

Мы разгаварыліся. Эдуард Самуйлёнак толькі што дэмабілізаваўся з Чырвонай Арміі і вось ужо месяц працуе інспектарам «Саюзмукі» па Полацкай акрузе.

— Вершы я не пішу, гэта так, забаўка. Мяне больш цягне да прозы.—гаварыў Эдуард.—падрыхтаваў я толькі два апавяданні. А пісаць ёсць аб чым і напішу. Толькі, ведаеце, надакучылі гэтыя млыны. І вельмі ўжо часта прыходзіцца бываць у дарозе: правяраць млын, спрачайся з млынарамі. Не ляжыць мая душа да іх. Вы кажаце, ёсць работа ў рэдакцыі? Вельмі ахвотна прамяняю на млыны. Буду ўдзячны. Падабаецца мне газетная работа.

Праз некалькі дзён Эдуард працаваў ужо ў «Чырвонай Полаччыне» літработнікам. Ён адразу здружыўся з калектывам рэдакцыі. Бываюць такія людзі, што з першай сустрэчы, з першай гутаркі прывабліваюць да сябе. Такім быў і Самуйлёнак. Ён не любіў адзіноцтва і адразу перайшоў на кватэру да мяне і Тараса Хадкевіча, хоць у яго быў добры пакой у цэнтры горада, побач з рэдакцыяй.

З прыходам Самуйлёнка на работу ў «Чырвоную Полаччыну» ажывілася газета. У ёй усё часцей і часцей пачалі паяўляцца фельетоны і апавяданні. Ажыла асоавіяхімаўская арганізацыя. Эд. Самуйлёнак арганізаваў вайсковы гурток, якім сам кіраваў. Любіў ён вайсковую справу.

У гэтым-жа годзе ён пачаў сабіраць матэрыялы для вялікай кнігі-трылогіі «Пажар павуціння», перайменаванай ім пазней у «Пагібель воўка». Адначасова з гэтым ён піша аповесць «Насустрач будучыні»—пра комунараў-чырвонаармейцаў, якія прыехалі ў Махіроўшчыну, каб пабудаваць комуну. Над сваімі творамі ён працаваў настойліва. Калі ўвесь матэрыял быў сабран, ён распрацоўваў падрабязны план нават кароткага апавядання. Самуйлёнак быў вельмі патрабавальным да сябе. Ніколі ён не здаваў у друк недапрацаванага твора. Заўсёды акуратна перапісваў чарнавікі, выкідваў цэлыя старонкі, запісваў нанава і часта хадзіў па пакою ўзбуджаным. Клікаў мяне:

—Разумееш, трэці раз перапісваю «Тэорыю». Як ты думаеш, гэта добра ці не, кажы праўду. І ён пачынаў чытаць толькі што напісаны раздзел з «Пажара павуціння» ці з «Тэорыі Каленбруна».

— Ліха яго ведае, адно пішу, а другое падганяе. Столькі матэрыялу, столькі тэм!

Пісаў ён хутка. Памятаю, што «Тэорыю Каленбруна» ён напісаў за два з паловай месяцы. А пасля адклаў у бок.

— Хай паляжыць, прасохне,—казаў ён. І толькі праз год адважыўся здаць у выдавецтва, калі дзесяткі разоў праверыў кожнае слова і радок.

Я здзіўляўся яго напорыстасці ў працы. Ён штодзённа і акуратна, у вызначаны час, па 3—4 гадзіны пасля рэдакцыйнай работы займаўся літаратурнай працай. І часта ў нас былі сутычкі. Самуйлёнак лаяў мяне, што я не працую.

— Малады—зялёны. Вучыцца трэба. Не траць марна часу на глупства. Што зробіш цяпер—у будучым знойдзеш. Што страціш—не навярстаеш. Я не слухаў яго. І толькі пазней, праз некалькі год, зразумеў я, наколькі быў праў Эдуард.

Мы дзевяць год дружылі. Шмат засталося ў памяці незабыўных сустрэч з гэтым чулым і сумленным таварышам і благародным чалавекам, з гэтым выдатным пісьменнікам. І сустрэчы гэтыя нельга забыць.

Анатоль АСТРЭЙКА.



Шалва Дадіані, Эдуард Самуйлёнак, Віталій Вольскі. Грузія, 1935 год.

У ГРУЗІІ



Э. Л. Самуйлёнак у 1936 годзе.

У 1935 годзе мне прыйшлося зрабіць разам з Эдуардам Самуйлёнкам паездку па Грузіі. Памяць аб гэтых днях захавалася ў мяне назаўсёды. Два з паловай месяцы правялі мы ў гэтай цудоўнай краіне. Мы пабывалі ў гарах Казбека, былі ў Кахеціі — у Цалаве і Сігнахі, у Мцхеце, у Кутаісі, Зэстафоні, Чызбуры, Поці і Батумі.

Усё бачанае намі ў Грузіі зрабіла на Эдуарда выключна моцнае ўражанне. Ён горача палюбіў гэту краіну воінаў, паэтаў і будаўнікоў цудоўнай будучыні. Душою мастака прагна ўбіраў ён вобразы яе гераічнага мінулага, яе вялікай і багатай старажытнай культуры.

Прабыванне ў Грузіі пакінула незабыўны след у творчасці Самуйлёнка. Ён значна ўзбагаціў сябе новымі ўражаннямі, яркімі фарбамі і вобразамі. Ён пашырыў свой творчы кругагляд. Вынікам прабывання Эдуарда ў Грузіі з'явіўся такі манументальны твор, як раман «Будучыня», лепшы з твораў пісьменніка.

У гэтай невялічкай заметцы мне хочацца даць чытачу хоць некаторае ўяўленне аб тым, што бачыў Эдуард Самуйлёнак у Грузіі, якімі вачыма глядзеў ён на гэта, чым ён захапляўся, як пісьменнік, што прыцягвала яго ўвагу.

Мне ўспамінаецца зараз наша сумеснае прабыванне ў Мцхеце, старажытнай сталіцы грузінскіх цароў. Нідзе так ярка не адчуваецца аблічча старой Грузіі, як іменна ў Мцхеце і яго ваколіцах. Цудоўнае спалучэнне кантрастаў так многа дае тут воку і пачуццю мастака.

Конусападобныя купалы цэркваў высяцца над маленькімі домікамі, над зялёнымі садамі, над жоўтымі водамі Куры.

Усё ў гэтым ціхім і сонлівым паселішчы авеяна памяццю старажытных часоў.

Маленькі, глухі гарадок быццам дрэмле, знясілены сваёй ранейшай славай, нібы марыць аб сваім велічным мінулым. За тоўстымі старажытнымі сценамі замка, за вежамі і байніцамі высяцца адвечныя руіны царквы Свеці Цхавелі, пабудаванай у X стагоддзі.

Са скрыпам і стогнам адчыняюцца іржавыя вароты. Сівабароды манах у чорнай расе, з сівой коскай пад белым вязаным клабуком, уводзіць нас у царкву.

Холад і поўзмрок.

Мы ўспамінаем Лермантава. Нішто, здаецца, не змянілася з таго часу.

Ці ж не гэты самы стары манах увекавечан у цудоўных радках паэта, які некалі наведваў гэтыя сцены?

Теперь один старик седой,
Развалин страж полуживой,
Людьми и смертию забыт,
Сметает пыль с могильных плит,
Которых надпись говорит
О славе прошлой и о том,
Как, удручен своим венцом,
Такой то царь в такой то год
Вручил России свой народ...

Вось і медзяныя пліты над магіламі памёршых цароў Грузіі—Іраклія II і Георгія XII.

Эдуард доўга стаіць, задумаўшыся, над гэтай плітай. Запісвае нешта ў блакнот. Паблісквалюць акуляры з-пад насунутага на лоб капялюша.

Цёмныя каменныя сцены. Цяжка навіслі змрочныя скляпенні. Магільная цішыня і спакой.

— Тут, здаецца, спынілася жыццё, спыніўся час,—гаворыць Эдуард.

Але гэта толькі здаецца. За гэтымі-ж скляпенняміззяе сонца, ззяе цудоўнае блакітнае неба.

Мы страсаем з сябе здрантвенне, навеянае мёртвымі помнікамі даўно мінулых часоў.

Ля варот царквы, у халадку, каля старажытнай вежы смуглявы прыгожы хлапчук узлез на дрэва. Ён глядзіць на нас цікавымі, жвавымі і бліскучымі вачыма.

— Аб такім хлопцу варта напісаць добрую кнігу, — весела ківае яму Эдуард.

Гэтаму хлопцу суджана было зрабіцца правобразам Іліко ў «Будучыні».

Мы выходзім на бераг Куры. Ідзём к дамбе ЗАГЭС'а.

Эдуард спыніўся на дамбе.

Над мутнымі, імклівымі водамі Куры высіцца магутны будынак электрастанцыі. На процілеглым беразе, на стромкіх схілах прыбярэжных скал жыллё першабытнага чалавека.

Які яркі і рэзкі кантраст!

Перад намі два полюсы чалавечай культуры. Колькі разоў першабытны чалавек, які змагаўся за сваё мізэрнае жыццё з пячорным мядзведзем, глядзеў, магчыма, адтуль, зверху, на процілеглы бераг,—туды, дзе высіцца зараз турбіны ЗАГЭС'а. Перад яго магутным поглядам рассцілаліся жоўтыя голыя схілы гор.

Знік гэты чалавек і ніколі не даведаецца ён, што пабудавана тут, на берагах гэтай бурнай рэчкі, творчым геніем яго, магчыма, прамых патомкаў. А жыллё захавалася дагэтуль. Нібы засталося ад старажытных часоў знарок—для супастаўлення, для гістарычных параўнанняў, для кантрасту.

Кантраст гэты яшчэ больш узмацняецца, калі мы падыходзім да сярэдзіны дамбы.

Помнік Леніну. Рука правадыра ўладарна паказвае ўніз, на ўпіхаміраную стыхію, на жоўтыя, бурныя воды Куры.

У далечыні, на высокай гары, старажытная язычаская царква. Царква сонца, Армазі-мта, гара Ормузда,—так называецца гэта месца, ператворанае яшчэ ў VI стагоддзі ў хрысціянскі манастыр і апетае Лермантавым.

Тут, пры зліянні Арагвы з Курой, моўчкі стаяць адзін перад другім суровыя вартаўнікі эпох.

На дамбе чырвонаармеец. Мерным і цвёрдым крокам ходзіць ён узад і ўперад.

Вадзяны пыл, як дым, падымаецца над ракою.

З шалёным рыкам кіпіць Кура ля надвалін дамбы і белым вадаспадам ападае ўніз. Няма мяжы яе шаленству. Але шаленства ракі не бясплённа: яно ператвараецца ў сілу, у энергію, у святло.

Воды яе рухаюць наперад развіццё гэтай раскошнай, цудоўнай краіны.

Аб гэтым гаворыць Эдуард, стоячы на дамбе ЗАГЭС'а, ля помніка Леніну.

Тут упершыню зарадзілася ў яго мысль напісаць вялікі эпічны твор, прысвечаны Грузіі. У далейшым, у часе нашай паездкі ў Мінгрэлію,—у Калхіду,—мысль гэта набыла канкрэтныя формы. Яна знайшла сваё ўвасабленне ў рамане «Будучыня».

ВІТ. ВОЛЬСКІ.

Ю. ДВОРКІНА

ВЫДАТНЫ ТВОР

У літаратурнай спадчыне рана памёршага Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка цэнтральнае месца займае яго выдатны раман «Будучыня». Спеласць майстра, тонкая назіральнасць, глыбокае разуменне супярэчлівых грамадскіх працэсаў, дасканаласць мастацкіх прыёмаў характарызуюць гэты твор, адзін з самых лепшых твораў беларускай мастацкай прозы.

У 1935 годзе Самуйлёнак некаторы час пражыў у Грузіі. Своеасаблівасць, нават некаторая экзатычнасць для беларуса грузінскага жыцця, прыгожасць прыроды, ярка выражаныя рысы гордасці, мужнасці, гасціннасці, таварыства ды іншыя выдатныя рысы нацыянальнага характару працоўных Грузіі прыцягнулі да сябе ўвагу пісьменніка, які і раней у сваіх апавяданнях маляваў моцных людзей, адданых барацьбітоў,—непахісных, энергічных і мужных.

Самуйлёнак задумаў напісаць твор, у якім-бы адлюстравалася ўсё жыццё Савецкай Грузіі за годы савецкай улады, рост людзей, росквіт іх шчасця, іх змаганне і перамогі.

Ён ажыццявіў толькі першую частку сваіх намераў, стварыўшы гераічную эпапею жыцця і змагання грузінскага народа ў 1920 годзе супроць меншавіцкага ўрада Ноя Жорданія і англійскіх інтэрвентаў—за пралетарскую рэвалюцыю, за шчаслівае жыццё, за сонечную будучыню. І хоць напісана толькі першая частка, яна мае выгляд цалкам закончанага твора.

У рамане «Будучыня» Самуйлёнак выводзіць вялікую колькасць персанажаў. У якасці асноўнага моманту іх характарыстыкі ён узяў іх адносіны да грандыёзных баёў эпохі. Зроблена гэта правільна, удумліва і тактоўна. Працоўны грузінскі народ, які пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў змагаецца супроць сваіх прыгнятальнікаў,—вось асноўны станоўчы герой рамана. Высокія маральныя якасці грузінскага народа раскрывае пісьменнік у вобразах сялян і рабочых—носьбітаў народнага гора, пакут, нянавісці, Арцём, Міха Коркія, Тарыэл Кверквелія, Міхаіл Ганарджыя, Элія Бокучава, бальшавікі Бесо Коркія, Тэафіл Габісонія, Курыдзе ды інш.—усе яны сыны вялікага грузінскага народа, носьбіты яго высокіх маральных якасцей, тыповых рысаў, і, разам з тым, кожны з іх—індывідуальны, непаўторны чалавек. У кожнага—сваё жыццё, свае пакуты, свае пачуцці.

Самуйлёнак з'яўляецца адным з першых беларускіх пісьменнікаў, якія парушылі старую і даўно ўжо аджыўшую традыцыю ў беларускай літаратуры, калі сялянства паказвалі ў выглядзе адсталых, забітых людзей. Сяляне ў «Будучыні»—мужныя, энергічныя людзі, з глыбокімі чалавечымі пачуццямі і маральнымі якасцямі. У паказе гэтых людзей адчуваецца любоў і пашана да іх. Праз партрэты, праз размовы і дзейнасць герояў, а не шляхам развагання аб іх, характарызуе Самуйлёнак сваіх герояў. І асабліва каштоўна тое, што пісьменнік імкнецца пазбегнуць будзённых, шэранькіх характарыстык. Ён умее паказаць чалавека ў асабліва напружаныя моманты жыцця, калі ўсе яго якасці яскрава раскрываюцца перад людзьмі. Вось ператварэнне дабрадушнага Тарыэла ў энергічнага мсціўца за здзекі над сялянамі і за смерць бацькі; у напружаным эпізодзе кляненця ў непрымірымасці сваёй да ворагаў Лагоны і мяккі Тапурыя; развітваючыся з сынам, бальшавіком Бесо, упершыню адчувае Арцём беспакойныя імкненні наперад, туды, дзе ў шуме ветру і хваль паплыў яго сын.

Эмацыянальная ўсхваляванасць у той ці іншай форме, у кожным выпадку пасвойму абгрунтаваная і выражаная, афарбоўвае вобразы станоўчых персанажаў. Гэта—сапраўдныя людзі, з разнастайнымі пачуццямі і думкамі. Вось, напрыклад, партрэт Тарыэла ў часе пахавання яго бацькі: «Тарыэл стаяў выпрастаны на ўвесь свой магутны рост. Запалыя вочы яго гнеўна глядзелі з-пад звезеных чорных брывей, пад смуглай скурай загарэлых худых шчок рухаліся жаўлакі. І хапя ўсе бачылі дробную светлую кроплю слязы, што павольна сцякала па шчацэ, гэта не змяншала ўражання пагрозы, якой дыхала ўся постаць Тарыэла. Ён зусім не быў падобны да таго дабрадушнага Кверквелія, якога кожны дзень прывыклі сустракаць на полі яго ныя суседзі З павязанай галавой, з падсумкам ля пояса і з вінтоўкай у руцэ, грозны і суровы, стаяў ён наперадзе маўклівай, нясмелай грамадкі ўзброеных людзей. І паступова ўціхлі плач, рух і гоман».

Гэтак-жа лаканічна і разам з тым жыва, праўдзіва і з асаблівай цеплынёй паказвае Самуйлёнак Серго Орджанікідзе, які вёў Чырвоную Армію на дапамогу грузінскаму народу. Самуйлёнак змог у палачы партрэта незабыўнага палкаводца і правадыра вылучыць індывідуальна-непаўторныя рысы тав. Орджанікідзе і паказаць іх у адзінстве з тыповымі рысамі непахіснага бальшавіка, энергічнага барацьбіта за справу рэвалюцыі. «Орджанікідзе раптам усміхнуўся вельмі весела. У кутках ля вачэй азначыліся маршчынкі і ад гэтага ягоныя вочы сталі надзвычай добрымі. Невялікія чорныя вусы ўздрыганулі, верхняя губа смяшліва прыўзнялася і свежа бліснуў верхні рад белых, чыстых зубоў.

— А!—сказаў Орджанікідзе, — дык усё-ж такі вы іх абгулялі, не яны вас!?

— Мы іх, таварыш Орджанікідзе!—засмяяўся інжынер, адчуваючы сябе добра і проста ў прысутнасці палкаводца, які нядаўна ўзяў Баку і цяпер вёў грозныя войскі на грузінскую контррэвалюцыю».

Пісьменнік не абмяжоўваецца толькі бытавой характарыстыкай сваіх станоўчых герояў. Каштоўнасць паказу ў тым, што ўсе яны маюць перад сабою перспектыву, мараць аб шчаслівым, радасным жыцці і моцна вераць у лепшую будучыню свайго народа. «Чалавек заўсёды аб лепшым думае».—кажа Элія Бокучава. Гэта напружаная вера ў лепшае робіць станоўчых герояў героямі рамантычнымі. Гак жыццёва-рэалістычна і разам з тым рамантычна зроблен эпізод, калі Арцём праводзіць праз багны і лясы двух бальшавікоў на бераг мора, дзе іх чакае баркас: «За плячыма на многія вёрсты балотная глухамань, непраходзімыя зараслі, багны, курганы трысця, хмары камароў і маленькае сяленне, дзе яго дом і яго сям'я. Ён стаіць на рубяжы. Ззаду тое жыццё, што пражыў Арцём Коркія, наперадзе ў вольных ветрах мора, у шуме белапенных хваль—жыццё яго сына, Вісарыёна Коркія. Ён стаіць на рубяжы, на гэтай вузкай пясчанай касе, што служыць мяжой паміж морам і балотам. І, можа, лепш пражыць адну ноч у шуме ветру і хваль, тым год у жоўтым, балотным сне; можа, лепш загінуць у такую ноч, чым дзесяткі год карпець з матыгай на вузкім маленькім участку гомі і кукурузы».

Як бачым, пейзаж калхідскай нізіны і марскі пейзаж выкарыстоўвае пісьменнік для таго, каб падкрэсліць новыя, свабодалюбівыя думкі Арцёма, якія заносяць яго ў далечыню, туды, куды паплыў Бесо. Свежы марскі вецер, вольны шум хваль як-бы ўвасабляе прыгожую, рамантычную далячынь. Але гэта рамантыка цесна звязана з рэальнасцю. Бесо паплыў змагацца за будучыню, за шчасце, ён паехаў на актыўную партыйную работу.

Такая рамантыка, цесна звязаная з рэчаіснасцю, уласціва і вучонаму Андрэю Міхайлавічу. Ён марыць аб знішчэнні смяротнага подыху гнілога, малярыйнага паветра, аб ператварэнні забалочанай калхідскай нізіны ў прыгожы квітнеючы сад. З гэтай мэтай вандруе ён па лясах, адшукваючы старажытныя каналы, праз якія калісьці народы, жыўшыя на рацэ Фазіс (сучасны Рыён), адводзілі ваду ў мора. Андрэй Міхайлавіч—энтузіяст сваёй справы, ён умее марыць, глядзець і імкнуцца наперад. Ад усіх чуе ён, што яго мары рамантычныя, што ніколі яны не здзейсняцца. І толькі бальшавік Бесо ўпэўнівае вучонага, што яго праект ажыццявіцца.

Асабліва рамантычна гучыць хвалюючая, прасякнутая пафасам сцэна сустрэчы партызана Міхаіла Ганарджыя з старым бальшавіком Тэафілам Габісонія. З вялікім уздымам апавядае Габісонія аб Сталіне, аб яго выдатных словах, аб яго магутнай веры ў прыгожую сонечную будучыню. Габісонія, перадаючы словы вялікага Сталіна, раскрывае перад Міхаілам шырокія прасторы будучыні, дапамагае яму ўбачыць тое вялікае, за што змагаюцца лепшыя сыны грузінскага народа. «У доме Сільвестра Ломджарыя васемнаццаць гадоў таму назад, сустракаючы новы год, наш правадыр Сосо Джугашвілі ўзняў кубак і сказаў словы, якія запалілі душы нашы верай, надзеяй і прагнасцю барацьбы. Я памятаю, як сказаў ён гэта. Адкінуўшы рукой непакорныя свае валасы, ён абвёў усіх нас ясным поглядам благародных сваіх вачэй, ён з вялікай любоўю глянуў у нашы адкрытыя сэрцы, ён хораша ўсміхнуўся нам: «Вось ужо развіднела! — сказаў ён.—Хутка ўстане і сонца. Гэтае сонца будзе ззяць для нас. Верце ў гэта, таварышы!».

Так у адзінстве рэалізма і рэвалюцыйнай рамантыкі раскрываюцца вобразы станоўчых герояў-барацьбітоў.

Добрае веданне чалавечай псіхалогіі дапамагае Самуйлёнку вывуляць сутнасць герояў праз іх паводзіны, жэсты, іншы раз праз асобныя дэталі. Гэта асабліва датычыцца адмоўных персанажаў, як Сімон Гамрэкелі, Гунава, мадам Гамрэкелі, Пачулія ды інш.

Пісьменнік умее вылучыць асноўнае, тыповае для кожнага чалавека, паказаць яго цалкам невялікай колькасцю штрыхоў. Баязлівасць, прагнасць, нізкасць і крывадушнасць Сімона Гамрэкелі як нельга лепш раскрываюцца ў двух сцэнах— у сяленні Сагвасалю, дзе ён здзекуецца з Арцёма, і ў сцэне з Гунава, калі ён шкадуе свае грошы, але ліслiва падкупляе Гунаву. Таксама цалкам раскрываецца і Гунава ў гэтым эпізодзе і далей у карнай экспедыцыі. Нахабства і цынізм, звярыная жорсткасць і садызм, а таксама глыбока захаваная палахлівасць—вось рысы асобаатрадчыка.

Нельга не адзначыць і надзвычай глыбокага ведання пісьменнікам дзіцячай псіхалогіі. Асабліва цікавымі вобразамі дзяцей у рамане з'яўляюцца Іліко і Марэ. Як дарослых, так і дзяцей Самуйлёнак умее паставіць у такія сітуацыі, у якіх найбольш тыпова раскрываюцца іх асаблівасці, іх характэрныя рысы.

Не гледзячы на вялікую колькасць персанажаў і эпізодаў, раман мае вельмі ўдалую стройную пабудову. Сюжэтная лінія асобных герояў, пейзажы, жанравыя малюнкі, прыгодніцкія эпізоды,—усё стварае шырокае палатно тагачаснай рэчаіснасці.

Значэнне гэтага рамана цяжка пераацаніць. Шырокі і вольны паказ характараў, майстэрскае разгортванне сюжэта, драматызм інтрыгі, правільнае разуменне эпохі і сацыяльных суадносін, глыбокае пачуццё прыроды і выдатная назіральнасць паэта—усё гэта ставіць раман «Будучыня» у рад лепшых твораў савецкай літаратуры.

ТВОРЧАЯ ПЕРАМОГА КАМПАЗІТАРА І ТЭАТРА

„Міхась Падгорны“ у Тэатры оперы і балета БССР

Прайшоў год, калі мы бачылі оперу «Міхась Падгорны» у старой рэдакцыі. У тым выглядзе опера не магла задаволіць нас з прычыны недасканаласці лібрэта, адсутнасці драматургічнага развіцця, статычнасці дзеі. Акрамя таго, з-за нявопытнасці пастаноўшчыка, музыка оперы затушоўвалася.

Мінуў год, і мы ўбачылі новую рэдакцыю оперы «Міхась Падгорны» Е. Цікоцкага ў пастаноўцы рэжысёра Златагорава. Лібрэта оперы скарочана на дзве карціны (замест ранейшых 6 цяпер іх у оперы 4), адначасова ўзмацнілася драматургічная лінія спектакля. Асноўныя персанажы—Міхась і Марыся сталі сапраўды галоўнымі героямі і атрымалі правільнае выяшэнне ў спектаклі. Вобраз Анішчука, які засланяў Міхася ў першай рэдакцыі, зараз адышоў на другі план. Народная маса, якая была пасіўнай, цяпер стала дзейнічаючай, дапамагаючай выраашаць асноўныя праблемы спектакля.

Асноўнае ў оперы—гэта музыка, на разглядзе якой і неабходна перш за ўсё спыніцца. Музыка оперы «Міхась Падгорны» падкупляе сваёй шчырасцю і цеплынёй. Меладычная лінія вельмі яркая і яна арганічна звязана з беларускім фальклорам.

У оперы выкарыстаны папулярныя беларускія народныя песні: «Сягоння я тута, з заўтра паеду», «Выйду я ў садзік», «Ой пад дубам, дубам», «Вясельная песня», «Чырвоная каліна», «Я табун сцерагу» і рад іншых, якія вельмі ўдала пераплятаюцца з арыгінальным матэрыялам аўтара.

Музыка першага акта ў асноўным лірычная, акрамя фінала, насычанага суровым драматызмам. Пачатак акта пабудаван на беларускай народнай песні «Я табун сцерагу», якая надае яму сумны лірычны характар. Цікава напісана арыя Ганкі. Але пры наяўнасці добрага музычнага матэрыялу, у ёй ёсць істотны недахоп—недастатковае выкарыстанне вакальных магчымасцей мецца-сапрана (нізкая тэстура). Вельмі добрае ўражанне пакідаюць хоры і пляскі, асабліва «Па гарохаўю, па ячанню», створаныя кампазітарам з вялікім майстэрствам. Неабходна адзначыць дуэт Міхася і Марысі, прычым хвалюючая тэма любві, якая праходзіць у аркестры, вельмі добра дапаўняе гэту сцэну. Менш удалася арыёза Міхася, дзе зноў-такі не выкарыстаны магчымасці спевака (нізкі і сярэдні рэгістр), і вельмі моцнае ўражанне пакідае фінал акта, у якім дасягнута вялікае драматычнае напружанне.

Другі акт—кулацкае вяселле—з'яўляецца ўдалым ва ўсіх адносінах. Выдатная, шчырая музыка абрадаў, пабудаваная на беларускім народным фальклоры, пакідае вельмі моцнае ўражанне. Цудоўна зроблена арыя Марысі (пачатак акта), якая добра перадае ўнутранае хваляванне і гора беднай сялянскай дзяўчыны, выдадзенай замуж за нялюбага, але багатага, грубага і жорсткага кулака Зьмітрака Закрэўскага.

Трэці акт мае ў сабе таксама шмат добрай і, больш таго, выдатнай музыкі, але ў ім ёсць недахоп—некаторая астаноўка драматургічнага развіцця спектакля. Найбольш слабае месца ў музыцы—паяўленне і расказ Анішчука, вобраз якога, няўдалы ў драматургічных адносінах—банальны і схематычны, не мог атрымацца яркім і ў кампазітара. Акрамя таго, зніжаецца ўражанне і ад масавых сцэн, якія зусім статычныя і не дзейсныя. Але адначасова неабходна ўказаць на такія выдатныя моманты, як арыя Міхася, сцэна паміж Міхасём, Марысяй і Зьмітраком.

Чацверты акт у драматургічных адносінах з'яўляецца ўдалымным, ён добра завяршае оперу.

У агульным я яшчэ раз хачу падкрэсліць, што музыка Цікоцкага вельмі добрая, сапраўды оперная па форме, ярка раскрываючая вобразы спектакля.

Неабходна спыніцца на аркестроўцы, вельмі красачнай і дынамічнай. Але трэба таксама ўказаць і на некаторую перагрузку гучання аркестра, што паглынае вакальную лінію спевака. На гэта неабходна звярнуць увагу кампазітара і дырыжора.

Вялікую работу прарабілі пастаноўшчык Златагораў, мастак Волкаў і дырыжор Шнейдэрман па перапрацоўцы оперы, паказу яе ў новай рэдакцыі.

Пастаноўшчык Златагораў бліскуча справіўся са сваёй цяжкой задачай. Музыка оперы цяпер даходзіць да гледача, чаго не было ў старой пастаноўцы. Вялікая работа праведзена з салістамі і хорам. На сцэне бачыш жывых людзей. Праўда, з хорам яшчэ неабходна дапрацоўка, бо ў некаторых месцах хор статычны, напрыклад, у 1 і 3 актах.

Добрае афармленне зроблена мастаком Волкавым, якому ў асноўным удалося паказаць беларускі пейзаж. Як на недахоп, укажам на няўдалую царкву ў 3 акце. Таксама добра было-б зрабіць багацейшымі дэкарацыі 2 акта.

Добра, з вялікім тэмпераментам і мастацкім чуццём вядзе спектакль дырыжор Шнейдэрман.

З выканаўцаў партый оперы неабходна адзначыць, перш за ўсё, народную артыстку рэспублікі Л. П. Александроўскую, якая стварыла хвалюючы вобраз беларускай дзяўчыны-сялянкі. Добра ўдаюцца ёй пераходы ад лірычнага становішча ў напружана-драматычнае. Выдатны голас дапамагае ёй глыбока раскрыць вобраз Марысі. Добрае ўражанне пакідаюць В. Лапін, Н. Лазараў (Міхась), В. Каліноўскі, засл. арт. рэсп. М. Дзянісаў (Зьмітрок), Н. Засецкі (Мартын), Л. Кцітараў (Ігнат Закрэўскі), Н. Зубковіч (дзесяцкі), Т. Хумарава, А. Букалава (Ганка).


Лапін і Лазараў стварылі поўнацэнныя вобразы Міхася, прычым у кожнага гэта атрымалася па-рознаму. Лазараў стварыў больш мужны вобраз Міхася. Але яму неабходна звярнуць увагу на вакальны бок. Яму, як маладому спеваку, трэба заняцца вакальнай вучобай, у рэзультаце мы можам атрымаць першакласнага опернага актора. Лапін—Міхась больш лірычны, ён валодае невялікім, але прыгожым голасам. Выдатная вакальная культура дапамагла Лапіну стварыць поўнацэнны вобраз Міхася.

Добра справіліся са сваёй цяжкой задачай—стварэннем вобраза кулака—акторы Каліноўскі і Дзянісаў.

У заключэнне хочацца ўказаць на істотны недахоп амаль усіх без выключэння актораў—на дрэнную дыкцыю.

На падставе разгляду ўсіх якасцей оперы «Міхась Падгорны» можна зрабіць вывад, што яна з'яўляецца каштоўным укладам у савецкую оперную літаратуру і варта паказу на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

Кампазітар А. БАГАТЫРОЎ.



Якуб Колас. Новая работа засл. дзеяча мастацтваў БССР скульптара З. Азгура. Фота І. Каплінскага.

РАБОТА НАД ОПЕРАЙ „КВЕТКА ШЧАСЦЯ“

У пачатку студзеня ў тэатры оперы і балета БССР разгарнулася энергічная работа над беларускай операй кампазітара А. Е. Туранкова «Кветка шчасця».

Опера малюе ўзаемаадносіны паміж сялянамі і памешчыкамі ў другой палове XIX стагоддзя. Змест яе грунтуецца на народным паданні: «хто ў ноч пад Івана Купалу знойдзе кветку папараці, той будзе навек шчаслівым». Лібрэта паэтаў-ордэнаносцаў П. Броўкі і П. Глебкі насычана народнымі песнямі, народнай весялосцю і юмарам.

Трэба шчыра сказаць: музыка оперы, пабудаваная на народнай песні, ярка і красачна малюе жыццё і быт беларускай вёскі таго перыяду. Музычныя вобразы наіўнай сялянскай дзяўчыны Надзейкі, яе брата Андрэя—чалавека, больш спрактыкаванага жыццёвым вопытам, ведаючага сапраўдную прыроду памешчыкаў і эксплаататараў,—напісаны поўнакроўна, эмацыянальна, ярка. Музыка падкупляе сваёй шчырасцю, цеплынёй і багаццем мелодый.

Усе калектывы тэатра працуюць над операй з вялікім натхненнем. Ужо развучаны музычна-харавыя і сольныя партыі, праходзяць агульныя спеўкі. У поўным разгары рэпетыцыйная работа аркестра.

З такім-жа натхненнем працуе балетны калектыў тэатра. У оперы «Кветка шчасця» шмат сюжэтных танцаў, якія патрабуюць рэжысёрскай выдумкі. Такія танцы, напрыклад, «Праследванне ведзьмы» і «Таўкачыкі» ў першым акце, «Юрачка» у трэцім акце і інш. Наогул, трэба сказаць, што ні ў адным оперным спектаклі танцы не займаюць такога значнага месца, як у оперы «Кветка шчасця». Не толькі артыст балета, але і спевакі-салісты, артысты хора—усе танцуюць.

Пастаноўка асноўных танцаў закончана. Зараз пачаліся зводныя рэпетыцыі першага акта.

Ставіць оперу мастацкі кіраўнік тэатра І. Ю. Шлепянаў, галоўны дырыжор спектакля—ордэнаносец Н. Б. Грубін, пастаноўшчык танцаў—галоўны балетмайстар тэатра—К. А. Мулер. І. П.

ЛІТАРАТУРА ДА ДЭКАДЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА У МАСКВЕ

Да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве рыхтуецца выданне раду кніг і брашур. Будзе выдан зборнік «Мастацтва Савецкай Беларусі», прысвечаны тэатру, драматургіі, музыкальнай творчасці, народнай творчасці і выяўленчаму мастацтву. Асобнай кнігай выйдуць «Нарысы па гісторыі беларускага тэатра». Кніга будзе ўключана паасобным томам у 15-томную серыю «Нарысаў па гісторыі тэатраў СССР», якая падрыхтоўваецца дзяржаўным выдавецтвам «Мастацтва» сумесна з навукова-даследчым інстытутам тэатра і музыкі.

Асобныя зборнікі выйдуць аб пастаноўках опер «Міхась Падгорны», «Дрыгва», «Кветка шчасця» і балета «Салавей».

Рыхтуюцца зборнікі артыкулаў аб Оперным тэатры БССР і аб Белдзяржрамтэатры.

Рыхтуецца кніга нарысаў «Беларускае выяўленчае мастацтва». Кніга будзе ўключана ў 10-томную серыю «Нарысаў гісторыі выяўленчага мастацтва СССР», якая падрыхтоўваецца выдавецтвам «Мастацтва».

Да дэкады будзе выдана шмат даведачнай літаратуры: праграм спектакляў і канцэртаў, каталаг выстаўкі беларускага выяўленчага мастацтва і г. д.

Агульны тыраж усіх выданняў—110 тысяч экземпляраў.

ПАСПЯХОВАЯ РАБОТА МАЛАДОГА ТЭАТРА

„Падзь Сярэбраная“ у Гомельскім абласным рускім драмтэатры

Пагодзін — драматург-нарысіст. І таму гавораць: яго п'есы—аднадзёнкі, яны жывуць не больш аднаго-двух сезонаў. Ці так гэта? Так, п'есы Пагодзіна заўсёды прысвячаюцца актуальнай і вострай на дадзены момант тэме. Але нельга забываць, што па-сапраўднаму мастацкі нарыс, у якім рукою мастака зроблен накід якогасьці кавалачка жыцця, мае права на такое-ж доўгае існаванне, як творы любога іншага жанру. І вельмі шкада, што тэатры глядзяць на раней напісаныя п'есы Пагодзіна, як на безнадзейна ўстарэлую аднадзёнку. «Мой друг», «Пасля бала», «Арыстакраты», «Падзь Сярэбраная» маюць поўнае права і зараз быць на сцэне.

Гомельскі рускі абласны драмтэатр зусім правільна зрабіў, калі ўключыў у свой рэпертуар «Падзь Сярэбраную». На самой справе, з якога часу тэма аховы рубяжоў нашай краіны перастала быць актуальнай? Што значыць «адыграная» п'еса, калі яна незнаёма гледачам дадзенага горада, і, нарэшце, хіба гэта твор антымастацкі?

Пастаноўшчык спектакля Е. А. Сакалоў зразумеў гэта. Ён адчуў своеасаблівасць пагодзінскага стылю і знайшоў спосаб раскрыцця асаблівасцей пагодзінскай п'есы ў спектаклі. Ён стварыў спектакль-нарыс.

Беглаць выкладання, вайстрыню становішча, уласцівы аўтару юмар рэжысёр падхопліваў і развівае. Адсюль «цудоўнае» паяўленне чырвонаармейцаў з купін у першым акце, інтэрмедыя паздраўлення Тані з замужжам, фінал апошняй карціны. Спектакль атрымаўся лёгкі, культурны, цікавы.

Чэркасава іграе П. Ф. Бахціна—іграе мякка, проста, не пераігрываючы. Пачуццё праўды нідзе не зраджвае актору.

Актора можна папракнуць толькі ў тым, што ў пагоні за жыццёвасцю, за праўдзівасцю ён страціў у нейкай ступені яркасць, індывідуальнасць героя. Больш свежасці, больш яркай індывідуальнасці, больш фарбаў! — хочацца падказаць актору.

Таню іграе Л. П. Сахарава, але іграе не так, як трэба. Вінаваціць у гэтым трэба не толькі актрысу, але і рэжысуру. Ці-ж не ўваходзіць у простыя абавязак рэжысёра ламаць акторскі рысунак ролі, калі ён не правільны? Л. П. Сахарава робіць даскапала тое, што задумана ёю. Уласцівай ёй акторскай абаяльнасцю яна захапляе гледача, прымушае любіць вобраз. Але яе замысел разыходзіцца з аўтарскім замыслам. У яе шмат слабавольнага ныцця, слязлівасці. У пагодзінскай-жа Тані, калі і прарываюцца слёзы там-сям, дык гэта слёзы не ад слабасці, а ад злосці на сваё бяссілле, волевыя слёзы. Гэта дзяўчына перамагае слабасць, змагаецца з ёю. У гэтым сэнс ролі.

Б. М. Кукес іграе Мансурава, байцакаўказца. Складаная роля, цяжкая па сваёй вострай характэрнасці, па небяспецы ўпасці ў бытавізм альбо ў шарж, ці ў нуднае стандартнае рамесніцтва. Кукес перамог цяжкасці. Акцэнт гаворкі ён будуе не на выгаварах, а на рытме, і гэта, вядома, адзіна правільнае рашэнне. Своеасаблівасць рытму і пластыкі рухаў ён дае ўмеру, без утрыроўкі. Актор валодае пачуццём юмару і тонка выкарыстоўвае ўсе камічныя сітуацыі.

А. П. Ільясава іграе жонку Бахмецьева—Соф'ю Андрэеўну. Гавораць, што якасцю гэтай актрысы з'яўляецца няроўная ігра—на адным спектаклі іграе выдатна, на другім—зусім дрэнна. Мы бачылі яе ў некалькіх спектаклях («Васса Жалезнова», «Падзь Сярэбраная») і павінны шчыра сказаць, што ўзлётаў натхнення не было—было шэрае, нуднае, калі не сказаць больш, з націскам і пераігрываннем выкананне. Уласна кажучы, аб вобразе з гэтай прычыны і гаварыць цяжка. На сцэне мітусілася нервовая жанчына, якая не асабліва ўмела дэманстравала, нібы ўласцівую ёй, «жалезабетоннасць».

Удачамі спектакля трэба прызнаць выкананне ролей японскіх афіцэраў: паручыка Івасакі—К. І. Маславым і маёра Такэда—М. Э. Персціным. Маслаў тонка, каларытна, а часам проста даскапала распрацаваў адны дэталі ролі, але затое апусціў другія (сцэна з фальшывым харакіры, малітва і інш.), чым пазбавіў ролю цэльнасці. Тым не менш выкананне яго прасякнута свежасцю мыслі.

М. Э. Персцін у ролі Тэкеда, можа, менш даскапала распрацоўвае дэталі, але ў цэлым дасягае стварэння поўнацэннага вобраза. Персцін (як і Маслаў) робіць акцэнт не на этнаграфізм, а на развіццё мыслі аўтара ў раскрыцці ролі.

Мы не маем магчымасці падрабязна спыняцца на разборы выканання ўсіх удзельнікаў спектакля, хоць многія з іх—Чэрноў у ролі Кулькова, Палосін—старшыня, В. І. Сакалоў—повар Доўгі, вядома, заслугоўваюць гэтага.

«Падзь Сярэбраная», як і першыя два спектаклі, пастаўленыя ў Гомельскім тэатры, радуюць сваёй ансамблевасцю, якая, падпарадкоўваючы ўсё дзеля цэлага, не заціскае індывідуальнасці акцёраў, а дапамагае іх максімальнаму развіццю. Гэта каштоўнейшая ўласцівасць тэатра не выпадковая, яна—вынік таго выхавання, якое атрымаў калектыў. У гэтым сіла, своеасаблівасць і каштоўнасць маладога тэатра.

Ант. СЕГЕДЗІ.



У Маскве адбылася Усесаюзная канферэнцыя па вакальнай адукацыі. На здымку: злева — выступленне студэнткі III курса Дзяржкансерваторыі БССР Е. Л. Пашковай (клас праф. Ціханава); справа — у зале канферэнцыі: народны артыст РСФСР С. І. Мітай, нач. галоўнага ўпраўлення навучальных устаноў Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў Л. Е. Шапавалаў, народная артыстка СССР, дэпутат Вярхоўнага Совета РСФСР В. В. Барсава.

Фота-клішэ ТАСС.

Фальклорная экспедыцыя

Вучоны совет Магілеўскага педагагічнага інстытута вырашыў арганізаваць з 15 чэрвеня па 15 ліпеня 1940 года фальклорную экспедыцыю ў раёны Магілеўскай, Гомельскай і Віцебскай абласцей.

У склад фальклорнай экспедыцыі ўвойдуць студэнты-фальклярысты, літаратуразнаўцы і мовазнаўцы.

Фальклорная экспедыцыя ставіць мэтаю прайсці па маршруту вядомага збіральніка беларускай народнай творчасці П. В. Шэйна і ўстанавіць, якія змены адбыліся ў народнай творчасці гэтых месц за апошнія 30—40 год.

Акрамя гэтага, экспедыцыя запіша новы савецкі фальклор. А.

Майстар жывапісу

Да 30-годдзя мастацкай дзейнасці В. В. Волкава

Вялікае рускае мастацтва багата традыцыямі рэалізма. Вытокі гэтага рэалізма мы знаходзім ужо ў творчасці выдатнага народнага мастака, майстра рускай фрэскі Рублёва. Рэалізм праяўляецца ў творчасці Аляксея Венецыянава, а ў карцінах такіх тытанаў рускага жывапісу, як Васілій Сурыкаў і Ілья Рэпін,—дасягае свайго апагея.

Вялікія рускія мастакі, якія мужна служылі сваёй творчасцю народу, з чэсцю пранеслі дэмакратызм свайго мастацтва праз выпрабаванні дзесяцігоддзяў. Наследуючы лепшыя традыцыі гэтага мастацтва, савецкія мастакі развіваюць іх далей, ствараюць мастацтва сталінскай эпохі, непараўнальна больш магутнае па сваіх сродках ідэйнага ўздзейнічання на масы, чым мастацтва ўсіх мінулых эпох.

Зараз, калі мы гаворым аб творчасці заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Валенціна Віктаравіча Волкава, нам асабліва хочацца адзначыць сталае наследванне гэтага майстра традыцыям вялікага рускага рэалістычнага мастацтва, яго нязменную барацьбу, як мастака і педагога, за рэалізм у выяўленчым мастацтве Савецкай Беларусі.

Скончыўшы ў 1907 годзе мастацкае вучылішча ў Пензе, Валенцін Віктаравіч без экзамена паступае ў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. У краіне ў гэты час, пасля паражэння першай рэвалюцыі, панавала чорная рэакцыя, у асяроддзі перадавой буржуазнай інтэлігенцыі расла разгубленасць, у мастацтве выступілі на сцэну буржуазныя дэкадэнты, якія імкнуліся адвесці мастацтва ў бок ад жывога жыцця, у бок адцягненых эстэтычных любаванняў жывапісам. У каго вучыцца маладому мастаку? Некалі прагрэсіўныя перадвіжнікі, к гэтаму часу заналагаўшыя старой акадэміяй, самі скаціліся на пазіцыі новага акадэмізма і застою ў мастацтве. Буйнымі аўтарытэтамі ў вачах мастацкай моладзі прадаўжалі заставацца толькі І. Рэпін, В. Сурыкаў і В. Сераў, а з ранейшых кіраўнікоў старой акадэміі — К. Брулоў.

У Пензе настаўнікам В. Волкава быў вядомы перадвіжнік К. А. Савіцкі. У акадэміі Валенцін Віктаравіч вучыўся некаторы час у класе перадвіжніка Г. Г. Мясаедава, але аддаваў перавагу В. Е. Савінскаму, які займаў у той час майстэрню свайго настаўніка П. П. Чысцякова. В. Е. Савінскі быў пядрэнным педагогам, падобна свайму настаўніку вучыў галоўным чынам рысунку, пастаноўцы натуры, лепцы і прапорцыям, менш закранаючы жывапіс. У майстэрню захаджваў часамі П. П. Чысцякоў. Аднойчы Павел Пятровіч падышоў да Волкава, які пісаў натуршчыцу на фоне яркага дывана, і заўважыў:

—Пейзаж-то добры, а чалавека няма.

Не цяжка здагадацца, што, гаворачы аб «пейзажы», Чысцякоў іраніз іраваў па адрасу модных у той час у выніку ўплыву французскіх імпрэсіяністаў захапленняў чыста жывапіснымі праблемамі. Можна папракаць Чысцякова і яго методыку за «стары акадэмізм», але затое мы не можам не прызнаць, што ў годы разрастаўшагася дэкадэнцтва Савінскі аказаў на маладога мастака Волкава ўзначны ўплыў, дапамогшы яму вызначыцца на пазіцыях рэалізма.

У 1915 годзе, канчаючы акадэмію, Волкаў піша дыпломную карціну «Сусанна». У аснову карціны пакладзена біблейскае паданне аб яўрэйскай дзяўчыне і прэлюбадзеях. Сюжэт досыць распаўсюджаны ў жывапісу. Сусанну апяваў і француз Эннер, і рускі мастак Егораў, і іншыя майстры. В. Волкаў не ідэалізіруе Сусанну, як гэта рабілі многія. Ён напісаў яе не як жанчыну, узятую з самага жыцця, умела спалучыўшы прыгожасць форм цела з жывапіснымі эфектамі тканіны. У гэтай карціне Волкаў, бадай, бліжэй да К. Брулова.



Засл. дзеяч мастацтваў В. В. Волкаў.

Скончыўшы акадэмію, Волкаў застаецца ў Петраградзе, дзе яго застае Кастрычніцкая рэвалюцыя. З першых-жа дзён устанаўлення Совецкай улады Волкаў працуе для свайго рэвалюцыйнага народа. Да дня святкавання першай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ён напісаў два плакаты, за што быў прэміраваны. У 1918 годзе Валенцін Віктаравіч прымае ўдзел у мастацкай выстаўцы, арганізаванай у Зімнім палацы. У 1919 годзе Волкаў пераязджае ў Веліж, дзе выкладае ў народнай мастацкай школе. Пазней у Веліж прыехаў і М. Керзін, з якім Волкаў быў знаёмы яшчэ з Пецярбурга.

У Веліжы В. Волкаў разам з М. Керзіным у якасці дэкаратараў прымаюць актыўны ўдзел у рабоце мясцовага тэатра. Імі было аформлена некалькі спектакляў А. Астроўскага і горкаўская п'еса «На дне».

У 1923 годзе Волкаў і Керзін пераязджаюць у Віцебск. Волкаў да 1929 года выкладае ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме. Заслугі В. Волкава ў падрыхтоўцы кадраў беларускіх жывапісцаў некалькі аналагічны заслугам М. Керзіна ў падрыхтоўцы кадраў беларускіх скульптараў. Творчай прыродзе абодвух мастакоў былі глыбока чужды ўсякага роду фармалістычныя выкрутасы ў мастацтве, запазычаныя ад капіталістычнага захаду і сляпа перанасімыя некаторымі мастакамі на совецкую глебу. У Віцебску адзін час было засілле фармалістаў, якія спрабавалі нізрынуць рэалізм і ўмацаваць фармалізм у сістэме выкладання ў мастацкім тэхнікуме. Керзіну і Волкаву прыйшлося выгрымаць вялікую барацьбу супроць гэтых вульгарызатараў мастацтва. Яны перамаглі ў гэтай барацьбе, і ў гэтым вялікая заслуга Керзіна і Волкава перад выяўленчым мастацтвам Совецкай Беларусі.

Каштоўнасць Валенціна Віктаравіча Волкава як педагога састаіць у тым, што ён вучыў моладзь перш за ўсё рысунку, разуменню формы, законам перспектывы і кампазіцыі, карацей кажучы —грамаце і яшчэ раз грамаце, якая складае аснову жывапісу як мастацтва. Калі мастакі Н. Пашкевіч і М. Манасзон лепш за іншых валодаюць граматай і паспяхова растуць творча, дык гэтым яны ў значнай меры абавязаны свайму настаўніку В. Волкаву. Скульптары З. Азгур і А. Глебаў добра валодаюць пластычнай граматай толькі таму, што іх упарта вучыў гэтай грамаце М. Керзін.

Некаторыя нашы мастакі часам папракаюць сваіх былых выкладчыкаў у «старамоднасці» іх метаду, але за самой справе прычынай творчай няўдачы гэтых маладых мастакоў з'яўляецца іх непісьменнасць, а часам і адсутнасць таленту.

Працуючы ў Віцебску педагогам, В. Волкаў узмоцнена займаўся і творчасцю. Тут ім напісаны карціны «Партызаны», «Пілігрымы» і партрэт В. І. Леніна. Волкаву лепш удалася карціна «Партызаны», якая зараз належыць Музею рэвалюцыі БССР. Мы бачым на гэтай карціне партызанскі атрад у лесе ля кастра ў марозную ноч. Справа паяўляецца разведчык. Магчыма, гэта селянін з суседняй вёскі, які прышоў, каб паведаміць партызанам пра набліжэнне белапалякаў. У цэнтры—камандзір атрада. Па яго поўсагнутай і напружанай постаці, эфектна акрэсленай на фоне зарыва кастра, па руху рук вы адчуваеце, што ён слухае разведчыка і тым часам прымае рашэнне. Чырвоныя партызаны бяруцца за зброю, рыхтуюцца к нападу на ворага. Карціна некалькі сухая па жывапісу, напісана ў асноўным лакальнымі фарбамі, але пры ўсім гэтым яна і сёння, праз трынаццаць год пасля яе напісання, можа быць аднесена да ліку лепшых твораў беларускага мастацтва.

З 1929 года Волкаў жыве ў Мінску. Ён адзін з першых у Беларусі бярэцца за актуальныя ў совецкім мастацтве тэмы аб соцыялістычнай працы і людзях соцыялістычнай працы.

В. Волкаву было даручана зрабіць манументальныя роспісы на станцыі Негарэлае. Ім напісаны два панно: «Малацьба ў калгасе» і «Днепрабуд». Непасрэднае знаёмства з бытам калгасаў, выезд на Днепрабуд і збіранне эцюднага матэрыялу на рыштаваннях гіганцкай будовы дапамаглі мастаку выдатна справіцца са сваёй задачай.

Плошча кожнага панно—30 кв. метраў. Хаця В. Волкаў па свайму творчаму характару не монументаліст усё-ж у гэтых роспісах яму ўдалося дасягнуць значнага абагульнення тэматычнага матэрыялу і мастацкай формы, знайсці лаканічную кампазіцыю, так што змест панно ўспрымаецца з першага погляду, што асабліва важна для панно ў такіх людных месцах, як чыгуначная станцыя.

У 1937 годзе В. Волкаў прадаўжае працаваць над тэмамі аб працы. Ён піша карціну «Абмен вопытам». Мастак выбраў для карціны найбольш характэрны для таго часу сюжэт. Карціна пісана з натуры на мінскім заводзе «Бальшавік». Мы бачым на гэтай карціне старога рабочага, які любоўна перадае свой вытворчы вопыт моладзі.

У мінулым годзе В. Волкавым быў выкананы вялікі графічны фрыз для беларускага павільёна на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Тэма фрыза «Кастрычнік на Беларусі». Мопны рысавальшчык і знаўца дэкарацыйнай кампазіцыі, В. Волкаў добра справіўся з пастаўленай перад ім задачай. Фрыз выдатна завяршае сцэну галоўнай залы і добра чытаецца па адлегласці ў агульнай кампазіцыі афармлення.

Нельга не сказаць аб В. Волкаву як аб партрэтысту. Да ліку лепшых яго партрэтных работ перш за ўсё трэба аднесці партрэт жонкі і партрэт дачкі ў крэсле. Абодва гэтыя партрэты прадстаўлены ў Карціннай галерэі БССР. У першым партрэце Валенцін Віктаравіч паказаў сябе незвычайным майстрам лепкі чалавечага твару колерам, глыбокім аналітыкам, які ўмее падкрэсліць галоўнае ў характары паказваемай натуры. Мастаком знойдзена тое шчаслівае партрэтнае падабенства, якое здзіўляе вас не столькі падабенствам вонкавым, колькі выяўленай ім унутранай характарыстыкай вобраза. Цікавы па жывапісу і характарыстыцы псіхалогіі дзіцяці другі партрэт.

Цяпер заслужаны дзеяч мастацтваў Валенцін Віктаравіч Волкаў працуе над эскізам карціны аб Леніне і яго саратніках. Мастак імкнецца адлюстраваць на палатне гістарычнае пасяджэнне ЦК партыі 23 кастрычніка 1917 года, на якім Я. М. Свердлоў дакладваў аб становішчы ў Мінску. Мяркуючы па эскізу, карціна гэта абяцае быць адной з цікавейшых работ на надыходзячай мастацкай выстаўцы «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Валенцін Віктаравіч Волкаў таленавіты і культурны мастак, выдатны педагог. Ён шмат што зрабіў і нямала больш зробіць для далейшага развіцця выяўленчага мастацтва Совецкай Беларусі.

А. ДАЛІН.



Студыя «Ленфільм» выпускае на экраны фільм «Арынка», які апавядае аб гераічным учынку маладой чыгуначніцы. На здымку: кадр з фільма. Артыстка Л. Емельянцава ў ролі стрэлачніцы Арынкі.

Фота-клішэ ТАСС.

У ТЭАТРЫ

Першы свой вечар у сталіцы Совецкай Беларусі — у Мінску мы прысвяцілі тэатру.

Ён узнік перад нашымі здзіўленымі вачыма, як дзівосны палац з забытай ужо казкі маленства. На шырокай плошчы між белым снегам і сінім небам узносіўся манументальны і лёгкі адначасова, велічны, але не пакідаючы ўражання помніка, будынак тэатра. Ён заклікаў нас сеткай асветленых вокнаў...

Балет «Салавей»...

Не ведаю, як гэта здарылася. Але мы, старыя тэатралы, якіх не загіпнатызіруе пышны эфект, на гэтым спектаклі ад першага моманту, ад падняцця заслоны, адчулі, што такога балета не бачылі ніколі.

На сцэне была вясна — беларуская, вясковая, квітнеючая і сумная адначасова. І вясной каханне дваіх... Кожны рух іх, маладых і дужых, быў рытмам і танцам, быў вясной і каханнем. Зачараваныя, глядзелі мы на іх змаганне ў абарону свайго кахання. Усё жыло на сцэне, усё было праўдай. Знік тэатр, і засталіся толькі гэтыя двое і іх крыўда, крыўда ўсёй вёскі, і гвалт дзікі і бяздушны, супроць якога змагаліся яны. А потым усё больш сціралася адлегласць паміж намі — глядзельнай залай і беларускай змагаючайся вёскай пачатку XIX стагоддзя. На сцэне быў натоўп прыгонных сялян і якімсьці цудам іх нядоля, іх крыўда і спадзяванні былі выяўлены танцам.

Але чаму спікаліся і нашы кулакі? Але чаму ў дзяўчыны — суседкі нашай, якая, як і мы, прыехала сюды з нядаўна вызваленай Заходняй Беларусі, каціліся слёзы па шчоках, калі глядзела яна на танцуючы натоўп? Праз гэтыя слёзы глядзела яна, як душаць паўстанне вёскі, знішчаюць астатняе сялянскае дабро панскія гайдукі...

Вядома сіла слова — яно б'е, чаруе, тлумачыць. А тут быў толькі танец. Але пад уплывам гэтага танца, як пад уздзеяннем магічнага закляцця, знік тэатр і я ўспомніла мінулае. І ў думках маіх усплыло слова «пацыфікацыя», і яно — знаёмае, чорнае слова — нарадзіла ўспаміны. Зноў убачыла параскіданыя штыхамі польскай паліцыі ўбогія вясковыя хацінкі, зноў была ў хаце, дзе на падлозе, на бруднай саломе—забінтаваныя галовы, пакалечаныя рукі і ногі. І яшчэ адзін незабыўны малюнак—труп дзесяцігадовай дзяўчынкі, застыглы ў пакутлівых сударгах на шэрых прыдарожных каменнях. Успомніла адзін вечар, калі да Варшавы прыйшла вестка, ад якой ледзянее ў жылах кроў, — вестка з Ковеля. Памятаю прыцішаны, але грозны шэпт — што так, што вывела польская паліцыя з хат дзесяць сялян, што ў зімовую ноч павяла іх за горад і без суда расстраляла.

Вольныя сёння землі, братнія землі Беларусі і Украіны! Колькі пацыфікацый бачылі вы, колькі крыві пралілося на вашых палях пад уціскам польскіх паноў...

Ёсць у балеце сцэна, апошняя, калі маўклівы застыглы натоўп абуджаецца, калі рвецца да барацьбы. На вастрыях узнятых кос граюць пурпуровыя водбліскі. То палыхае панскі двор. Чырвонае зарыва ўздымае як сігнал трывогі, заклікае: вось прабіла ваша гадзіна! І натоўп у сярмягах, з сякерамі ў руках ідзе на барацьбу за волю.

Не, гэта не мінулае стагоддзе, гэта было ўчора — у XX стагоддзі.

Гэта наш учарашні дзень — чорны дзень Заходняй Беларусі ў панскім ярме.

Як зачараваная, выйшла з залы, як зачараваная хадзіла ў палацы тэатра, аглядала ўсё і ўсіх. Вось тэатральныя кулісы, вось гардэробы, радыёзала, чырвоны куток, лячэбныя кабінеты, залы рэпетыцый балета, хора... Усё — вялікае, светлае, утульнае, збудаванае з найвялікшымі клопатамі аб чалавеку. А потым была сведкай яшчэ больш дзіўнага: у кабінет дырэктара сышліся, як адна сям'я, харысты і салісты, тэхнічныя работнікі і мастакі-дэкаратары, малалыя дзяўчынкі з балета разам з праслаўленымі актрысамі. Ажыўленыя, вясёлыя і такія, па-совецку прыветныя між сабою, да нас і ўсяго працоўнага свету. Тут, як і ўсюды ў Совецкім Саюзе, — барацьба за адну, агульную мэту — за шчасце чалавека.

Варталіся мы ўсхваляваныя і маўклівыя. Мароз узмацніўся. На сінім небе мігцелі зоры, срэбранымі іскрамі зіхацеў снег пад нагамі. Але я не заўважала ні зор, ні снегу, — перад вачыма палыхала полымя... Гэта гарэў панскі двор, гэта беларускія сяляне ўзняліся з косамі на барацьбу за волю... І зразумела я, што для таго, каб маладая балерына магла так радасна расказваць аб сваім жыцці, патрэбен быў вялікі і магутны, ачышчаючы зямлю, агонь... У полымі рэвалюцыі нараджаецца людское шчасце.

ЕЛЕНА СЕЛЬМ.

Пераклад з польскай мовы.

МАЙСТАР РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ГРАФІКІ

На выстаўцы графікаў Беластока, адкрытай у Карцiннай галерэі БССР, досыць шырока прадстаўлена творчасць мастака Ю. А. Краеўскага. Яго кампазіцыі паказваюць жыццё працоўнага сялянства і гарадской беднаты пад прыгнётам польскіх паноў.

Трэба было валодаць рэволюцыйнай мужнасцю і сілай свядомага змагара, каб ва ўмовах жорсткага тэрору, які панаваў у панскай Польшчы, так недвухсэнсава і рашуча паказваць рэчаіснасць, як гэта рабіў мастак. Гэту яго якасць, якасць свядомага рэволюцыйнага мастака, можна прасачыць не па адной, а па ўсіх выстаўленых работах.

Малюнкі «Памешчыцкі прыказчык» і «За пару бульбін» паказваюць ва ўсёй аголенасці мярзотную сутнасць улады памешчыкаў і капіталістаў.

Меткім вокам мастака, вострай зброяй свайго алоўка ўскрывае ён і не менш жудаснае па сваёй праўдзе жыццё горада. Стары, ледзь пераступаючы нагамі, упрогшыся ў каляску, вязе непасільны груз — «Да апошняга подыху». Вобраз гэты цяжка забыць, ён праследуе гледача, як здань, і міжволі трагедыя, паказаная Краеўскім, выклікае праклянне і нянавісць да эканамічнага ладу, які асуджаў людзей на пакутлівую старасць. Ці вось — «Адна з вуліц Варшавы». З торбай на плячах ідзе па вуліцы стары ў пошуках пакупніка гузікаў ці іголак. Побач бязрукі з аголенай скалечанай нагой выпрошвае міласцінку ў прахожых. І побач «гаспадары горада» — тлустыя фігуры фабрыкантаў, якія з агідай глядзяць на гэтых прадстаўнікоў беднага свету, што з не меншай нянавісцю праводзяць вачыма адыходзячых багацеяў.

Краеўскі прысвячае сваё мастацтва класавай барацьбе, якая разгарнулася ў 1935—39 гадах па вёсках Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. У малюнку «Газета» мастак падкрэслівае характэрныя рухі сялян, якія ўважліва слухаюць чытальніка. Застыглы на важным слове селянін, з апусціўшыміся рукамі, штосьці спахмурнеў. Засцігнуты важным паведамленнем, застаўся нерухомым другі, з віламі ў руках, але павернутая набок галава і задумлівыя вочы яго як-бы пытаюцца: «Што будзе?»

А вось — «Сялянская забастоўка». Людзі з матыгамі ў руках гатовы да рашучых дзеянняў. На наступнай карціне «Шэсце сялян» (1935 год). Сяляне з косамі і каламі выступілі з вёскі. Іх твары поўныя гневу, дыхаюць нянавісцю і рашучасцю.

Мастацкія сродкі ў Краеўскага не ва ўсіх малюнках аднолькавыя. Ён не прытрымліваецца адной манеры пісьма. Вось бесперапынная ў сваёй экспрэсіі хвалістая лінія, якая стварае вобраз кастлявага старога з пакутлівым тварам, з застыглым жудасным вокам, што просіць аб дапамозе («Да апошняга подыху»). Жывапісныя плямы, мяккія і па-майстэрску звязаныя ў сваіх светлавых суадносінах («Песня»). Абрывістыя лініі, якія ідуць у напрамку складак вопраткі («Газета»). І спалучэнне разам памянёных прыёмаў у кампазіцыях «Шэсце сялян», «Ад зары да зары — на панскім» і інш. У работах Краеўскага адчуваецца рука ўмелага рысавальшчыка.

І ўсе гэтыя работы паказваюць, што аўтар іх глыбока перажываў пакуты сваіх герояў і побач з імі сваёй творчасцю ўдзельнічаў у барацьбе.

Творчасць мастака Краеўскага — значная з'ява маладога мастацтва заходніх абласцей БССР.

М. АЎСКЕР.

Да 6-годдзя з дня смерці Эдуарда Багрыцкага

МАЕ СУСТРЭЧЫ

Тры-чатыры месяцы сумеснага жыцця і работы з Эдуардам Багрыцкім у агітпоездзе «III Інтэрнацыянал» пакінулі глыбокі след у маёй памяці. Вобраз гэтага светлага чалавека, аднаго з лепшых совецкіх паэтаў, як жывы, стаіць перад мною.



Эдуард Багрыцкі.

У сярэдзіне лета 1920 года наш агітпоезд пасля таго, як абслужыў часці Чырвонай Арміі, якія праводзілі баявыя аперацыі на Каховскім плацдарме, трапіў у Одэсу. У часе знаходжання агітпоезда ў Одэсе ў калектыў работнікаў уступілі паэты Эдуард Багрыцкі і Іеронім Бланк (які хутка пасля грамадзянскай вайны памёр ад туберкулёза).

У поездзе выдавалася франтавая газета. Драматычная і канцэртная трупа абслугоўвала байцоў Чырвонай Арміі; часам аўдыторыя нашых гледачоў дасягала пяці-шасці тысяч чалавек.

Я жыў з Багрыцкім у адным купэ. У свабодны ад заняткаў час Эдуард чытаў вершы. І гэта натуральная змешанасць франтавой абстаноўкі з паэзіяй, з вершамі прымушала па-новаму адчуваць незвычайную сілу і важнасць паэтычнага слова. Багрыцкі жыў паэзіяй. Накіраваны ў цяжкі шлях, поўны нечаканых выпрабаванняў, Эдуард запасся вясёлым грузам вершаў, як баец запасаецца правіянтам. Ён уяўляў сабе будучую вайну, у якой ён будзе ўдзельнічаць байцом-вершнікам, нагружаным зброяй і кнігай: «Сабля и книга—чего еще?».

> А в походной сумке
> Спички и табак,
> Тихонов,
> Сельвинский,
> Пастернак.

Багрыцкі вельмі часта і з ахвотай чытаў вершы Маякоўскага. Мы, маладыя акторы, былі тады мала знаёмы з творамі Маякоўскага і першым чалавекам, які пазнаёміў нас з ім, прывіў да яго густ, прымусіў адчуць яго незвычайную сілу, быў Эдуард Багрыцкі. Яго ўласныя вершы шмат у чым былі падобны на вершы Маякоўскага. Сваёй работай франтавога паэта Багрыцкі ажыццяўляў на практыцы новыя прынцыпы грамадскіх паводзін, якія ўпершыню з асаблівай акрэсленасцю сфармуліраваў Маякоўскі.

Высокі, худы, у дэмісезонным карычневым паліто, у скуранай пацёртай фуражцы, Багрыцкі праводзіў бяссонныя ночы ў агітпоездзе. Ён усёй сваёй істотай жыў бурным жыццём фронта.

Мне помніцца, што ўжо тады, у 1920 годзе, Багрыцкі хварэў астмай. Часта па начах, калі Эдуарда душыла астма, ён прасіў мяне адчыніць акно вагона. Злёгку высунуўшыся, ён напружана ўдыхаў паветра.

У вагоне Багрыцкі зрабіў шмат зарысовак на франтавыя тэмы.

Яшчэ шмат цудоўных і таленавітых твораў напісаў-бы, калі-б жыў, Эдуард Багрыцкі — вялікі паэт рэволюцыі, светлай душы чалавек і таварыш, адданы сын сваёй радзімы.

А. АСТАХАЎ.

Заслужаны артыст рэспублікі.

ЧАРГОВЫЯ РАБОТЫ ЯЎРЭЙСКАГА ТЭАТРА

У гэтым годзе Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР працягвае сваю работу над лепшымі творамі неўміручага яўрэйскага класіка Шолам-Алэйхема. Днямі была выпушчана сатырычная камедыя «Сендэр Бланк» у пастаноўцы засл. арт. рэсп. Л. М. Літвінава.

Гэта камедыя, створаная па аднайменнаму твору Шолам-Алэйхема інсцэніроўшчыкам тав. Ойбельманам, дала магчымасць тэатру стварыць цікавы спектакль, паказаць гледачу галерэю сацыяльна-вострых вобразаў гніючага капіталістычнага грамадства, яркую галерэю шоламалэйхемаўскіх персанажаў.

Другой работай, прысвечанай Шолам-Алэйхему, з'явіцца спектакль «Блукаючыя зоркі». Папулярны і любімы ў народзе раман «Блукаючыя зоркі», які рысуе гібель народных талентаў у капіталістычным грамадстве, паслужыў яўрэйскаму совецкаму пісьменніку-ордэнаносцу Е. М. Дабрушыну ўдзячным матэрыялам для стварэння поўнацэннага драматургічнага твора.

Тэатр прыступіў да работы над інсцэніроўкай З. Аксельрода і Э. Кагана па Мендале-Мойхер Сфорым «Маленькі чалавек» (пастаноўшчык засл. арт. рэсп. М. Б. Сокал). Пастаноўка спектакля па твору Мендале-Мойхер Сфорым мае для тэатра асаблівае значэнне. Упершыню за час існавання тэатра мы звярнуліся да гэтага вялікага яўрэйскага класіка, і мы абавязаны паказаць поўнацэнны, высокамастацкі спектакль. З класікі намі ўключана ў рэпертуар таксама адна з лепшых камедый В. Шэкспіра «Дванаццатая ноч».

У гэтым-жа годзе будзе пастаўлена п'еса яўрэйскага совецкага пісьменніка М. Даніэля «Шлойме Маймон».

Для ўзбагачэння рэпертуару тэатра п'есамі аб сучаснасці намі заказана совецкаму яўрэйскаму пісьменніку Рыскінду п'еса аб калгасным жыцці.

Па заказу тэатра яўрэйскія совецкія пісьменнікі Э. Фінінберг і Н. Ойслендэр пішуць п'есу аб актыўным удзельніку грамадзянскай вайны, заўчасна загінуўшым яўрэйскім паэту Ошэру Шварцману. У гэтай п'есе будзе паказан вобраз геніяльнага правадыра працоўных В. І. Леніна і вобраз мужнага пролетарскага палкаводца Шчорса. Пастаноўка п'есы з вобразам Леніна з'явіцца для нашага тэатра асаблівай падзеяй. Ужо зараз ідзе падрыхтоўчая работа к пастаноўцы гэтай п'есы.

Аднак, трэба прызнаць, што далёка яшчэ не ўсё зроблена тэатрам для стварэння арыгінальных п'ес на актуальную совецкую тэматыку. Да гэтага часу мы ў нашым рэпертуары не маем твораў беларускіх пісьменнікаў і далёка не выкарысталі ўсіх магчымасцей работы з пісьменнікамі братніх рэспублік.

Па ініцыятыве тэатра ў бліжэйшы час будзе склікана нарада актыва тэатра з драматургамі БССР па абмеркаванню пытанняў рэпертуару. Гэта нарада павінна быць пачаткам вялікай сістэматычнай работы Яўрэйскага тэатра з драматургамі.

М. КАГАН.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН

ЗВЫЧАЙНЫ ДЗЕНЬ

У гэты дзень у мінскім Доме пісьменніка не адбылося нічога незвычайнага. Усё ішло сваім парадкам. Як і заўсёды, у прыёмным пакоі старшыні саюза размерана цікаў гадзіннік. Пад канец першай палавіны дня адзін за другім, з працяглымі інтэрваламі, на другі паверх па непадмеценай лесвіцы, праз груды акуркаў і смецця паволі ўзнімаліся супрацоўнікі.

Спачатку ішлі машыністкі, за імі работнікі бухгалтэрыі, Літфонда, потым супрацоўнікі рэдакцыі «Літаратура і мастацтва» і доўгачаканага журнала «Полымя Рэволюцыі». Крыху пазней, запыхаўшыся, спяшаўся кіраўнік спраў. Следам за ім праз пісклявыя дзверы важна ўваходзілі працаўнікі кабінета маладога аўтара, ці, як трапна назваў іх адзін член былой секцыі,—паэтычныя, празаічныя і трагікамічныя «консулы».

Працоўны дзень быў у разгары.

А другой гадзіне дня ля пад'езда прастужана чыхнуў матор. Увабраўшы галаву ў плечы, з машыны выйшаў чалавек з партфелем. Гэта быў самы галоўны начальнік, так-сказаць, чарговы дзяжурны член праўлення.

Праз клубы густога дыму, натыкаючыся на незнаёмых людзей, якія тоўпіліся ў калідорах, дзяжурны падышоў да масіўнага дубовага стала старшыні і, аддуваючыся, апусціўся ў крэсла.

У прыёмным пакоі спрачаліся.

— Грызуцца, зноў грызуцца... — прамовіў дзяжурны і, устаўшы з крэсла, памкнуўся быў прычыніць дзверы, але ў пакой разам з кіраўніком спраў увайшло тры незнаёмых мужчыны. Гэта былі арандатары клуба.

Следам за імі са скруткам паперы ў руках нясмела ўвайшоў малады чалавек. Ён стаў ля дзвярэй, здзіўлена пазіраючы то на дзяжурнага, то на спрачаўшыхся таварышаў і не могучы зразумець, дзе ён знаходзіцца.

— Ну, што вы?! Гэта-ж занадта танна... Не менш, як трыста рублёў за вечар... — настойваў дзяжурны.

Выціраючы ўспацелы лоб, упаўнаважаны «Заготптушкі», нарэшце, згадзіўся.

Калі шумлівыя арандатары клуба пакінулі накураны кабінет, дзяжурны заўважыў маладога чалавека.

—Вы да мяне?—і неўпрыкмет глянуў на гадзіннік.

— Я хачу свой твор на секцыі прачытаць.

— У вас вершы ці проза?

— Проза, — адказаў малады пісьменнік. І спагадзя дадаў: — Аповесць напісаў.

— Добра. Гэта мы можам арганізаваць. Я вось зараз...

Не скончыўшы сказа, дзяжурны замоўк. Некалькі хвілін, як-бы ўспамінаючы нешта далёкае, ён утрапёна глядзеў на прыгожы малюнак узбекістанскага дывана, што шырокім палотнішчам распластаўся на ўсю сцяну.

Запусціўшы пальцы ў свае рэдкія валасы, дзяжурны намагаўся ўспомніць злошчаснае прозвішча пісьменніка, які ўзначальвае секцыю празаікаў...

Нарэшце, дзень чыткі аповесці быў прызначан.

Стрэлка гадзінніка падпаўзла к чацвёртай гадзіне. Устаўшы з крэсла, дзяжурны паклаў блакнот у кішэню і пакінуў кабінет.

Надышоў дзень чыткі аповесці. Малады празаік акуратна ў вызначаны час з'явіўся ў перапоўнены клуб. Увайшоўшы ў раздзявальню, пачаў скідаць галошы і паліто.

— Што вы, малады чалавек, не распранайцеся, замерзнеце, — па-сяброўску параіў швейцар.

— А людзей колькі на маю чытку сабралася!

— На якую чытку? Гэта-ж нарада работнікаў «Заготскуры», — растлумачыў швейцар.

Усхваляваны, пераскакваючы адразу праз некалькі прыступак, малады празаік узляцеў на другі паверх. Дрыжачымі рукамі ён перагортваў абанентную кніжку, шукаючы нумар тэлефона дзяжурнага члена праўлення.

З трубкі данёсся абураны голас дзяжурнага:

— Як «Заготскура»? Нічога не разумею! Званіце таму, хто сёння дзяжурыў.

Урэшце, ля тэлефона сёнешні дзяжурны:

— Якая чытка? У маім дзённіку не значыцца.

— Дык што-ж мне рабіць?—разгублена пытаўся малады аўтар.

— Перанясём на заўтра,—супакойвалі ў трубцы. — Перанясём...

На другі дзень, увечары, у клубе пісьменніка адбывалася нарада. Не думайце, што гэта была творчая нарада пісьменнікаў. Гэта была нарада работнікаў «Заготшчаціны».

А. СТАХОВІЧ.

Музей А. П. Чэхава ў Ялце

Першы год сваёй хваробы А. П. Чэхаў правёў у Ніццы. Але ўжо ў 1899 годзе ён прыехаў у Ялту.

Выклікаўшы сястру Марыю Паўлаўну, ён паведаміў ёй:

—Ведаеш, я купіў участак. Заўтра пойдзем аглядваць. Цудоўная панарама.

Старшы супрацоўнік музея А. П. Чэхава ў Ялце — сястра пісьменніка Марыя Паўлаўна расказвае:

—Мы пайшлі з Антонам Паўлавічам аглядаць участак. Ішлі мы вельмі доўга і мне было прыкра, што ён купіў участак так далёка ад мора. Панарама, якая адкрывалася з участка, была цудоўнай— Ялта, як на далоні, і шырокі далягляд мора. Тады яшчэ быў відны мол, у порце стаялі караблі і параходы.

Мы вызначылі месца, дзе будзе стаяць дом, намецілі сцежкі ў будучым садзе, фантазіравалі аб прудах і фантанах, і так паглыбіліся ў мары, што нават забыліся, што ўчастак усё-ж няўдалы і што грошай на ажыццяўленне нашых мар няма.

Пачаўся збор сродкаў на будову дачы. Было прададзена Меліхава, выдаўцу Марксу былі прададзены творы. Усё адбывалася шпаркімі тэмпамі. Пісьменнік сам прысутнічаў на работах і кіраваў імі.

...Калі заходзіш зараз у гэты домік—музей Чэхава, дзе пісьменнік правёў апошнія гады свайго жыцця, вас адразу ахапляе тая чэхаўская гасцінная задумлівасць, тая ціш[ы]ня і спакой, аб якіх пісаў М. Горкі.

У доміку захаваліся рэчы пісьменніка, да якіх ён прывык, за якімі ён працаваў, якімі быў акружан. Наведвальнік адчувае выключную чэхаўскую атмасферу, якая засталася, захавалася і беражліва мякка ахутвае кожнага, хто прыходзіць сюды.

Аб гэтай цеплыні і гасціннасці пішуць у кнізе наведвальнікаў дактары і паэты, ордэнаносцы Ваенна-Марского Флота, калгаснікі-экскурсанты, совецкая моладзь. У чорным тоўстым сшытку захавалася мноства запісаў. Кожны з іх—усхваляваны, лірычны, задушэўны—гаворыць аб няўлоўным чэхаўскім водыры, які ёсць ў музеі.

«Я ўвесь час міжволі чакаў, што ў адну з дзвярэй вось-вось увойдзе мой любімы пісьменнік. Тут неяк не верыцца, што яго няма ўжо колькі год», — піша наведвальнік.

Чэхаўская атмасфера адчуваецца і ў садзе. Тут кветкі, якія садзіў Чэхаў і якія ён любіў. Тут, у далёкім кутку, на лавачцы сядзелі госці пісьменніка: М. Горкі, В. Караленка. Тут часта і доўга сядзеў Антон Паўлавіч, ратуючыся ад назойлівых наведвальнікаў.

На працягу звыш пяці год у доміку Чэхава пабывалі, апрача выдатных пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя, мастак Левітан, трупа мастацкага тэатра на чале з К. С. Станіслаўскім і Вл. І. Неміровіч-Данчанкам.

... У музеі Чэхава ў Ялце праводзіцца вялікая работа. Музей захоўвае каштоўныя дакументы, папаўняецца новымі. Напрыклад, улетку 1937 года былі знойдзены асабістыя дакументы і перапіска бацькі Чэхава—Паўла Егоравіча. Акуратна складзеныя і запячатаныя самім Антонам Паўлавічам паперы бацькі захоўваліся 40 год.

У адным з знойдзеных Марыяй Паўлаўнай Чэхавай пісьмаў А. П. Чэхава да Южына—Сумбатава было напісана: «І з хрысціянскага, і з эканамічнага, і з якога хочаце пункту гледжання — мяшчанства вялікае зло. Яно, як дамба на рэчцы, заўсёды служыла толькі для застою...»

29 студзеня 1940 года ўся наша краіна шырока адзначыла 80-годдзе з дня нараджэння вялікага майстра слова, інжынера чалавечых душ, які марыў аб знішчэнні мяшчанства, аб вольным жыцці, аб рэволюцыі. Словамі аднаго з персанажаў сваёй п'есы «Тры сястры» ён гаварыў аб рэволюцыі:

«Прыйшоў час, насоўваецца на нас аграмадзіна, рыхтуецца здаровая, моцная навальніца, якая ідзе, якая ўжо блізка і хутка садзьме з нашага грамадства лянноту, абыякавасць, гідлівасць да працы, гнілую нуду... Праз якія-небудзь 25—30 год будзе працаваць кожны чалавек. Кожны!»

Вялікая Сталінская Канстытуцыя запісала залатымі літарамі права на працу, аб якім, можа падсвядома, але ад усёй душы, марыў вялікі рускі мастак слова А. П. Чэхаў, чыя бессмяротная творчасць зрабілася здабыткам народаў нашай магутнай радзімы.

Міх. ГЕНАДЗІЕЎ.

У ПРАЎЛЕННІ ССПБ

3-га лютага адбылося чарговае пасяджэнне праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. На гэтым пасяджэнні былі абмеркаваны пытанні ўдзелу пісьменнікаў у дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

Тав. М. Клімковіч унёс на разгляд праўлення рад канкрэтных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы пісьменнікаў да дэкады. У прыватнасці, ён прапанаваў вылучыць дакладчыкамі на літаратурных вечарах у Маскве т. т. Я. Коласа, М. Лынькова, П. Броўку, А. Кучара, П. Глебку, В. Вольскага і інш. Для газет і журналаў крытыкі павінны падрыхтаваць артыкулы аб совецкай беларускай літаратуры. Трэба паскорыць падрыхтоўку і здачу ў друк анталогіі літаратуры і зборніка беларускага фальклору, падрыхтаваць выступленні паэтаў і пісьменнікаў па радыё ў Маскве і ў Мінску, арганізаваць выстаўку беларускай літаратуры ў маскоўскім Доме пісьменніка, накіраваць спецыяльныя літаратурныя старонкі ў газеты саюзных рэспублік, а газеце «Літаратура і мастацтва» і журналу «Полымя Рэволюцыі» выдаць спецыяльныя нумары, прысвечаныя дэкадзе.

Прапановы тав. Клімковіча прыняты праўленнем.

ВЫВУЧАЦЬ ПОМНІКІ МІНУЛАГА

Патрэбна захоўваць і вывучаць помнікі мінулага — рэволюцыйнай барацьбы, мастацтва, архітэктуры, старадаўняга побыту і вялікіх бітваў. Па помніках мінулага лягчэй узнавіць, уявіць перажытае і пройдзенае, каб яшчэ лепш і мацней любіць сучаснае, цаніць і берагчы яго.

Вось бабруйская крэпасць, узведзеная некалькі сот год назад і ў мінулым стагоддзі ператвораная домам Раманавых у месца жорсткіх катаванняў рэволюцыянераў, у месца ссылак. За сценамі крэпасці муштравалі салдатаў дысцыплінарнага батальёна. Муштра была да таго жорсткай, што аднойчы гэта выклікала паўстанне салдатаў, якое было падаўлена расстрэламі. У 1920 годзе белапалякі расстралялі ў гэтай крэпасці групу адважных бабруйскіх комуністаў. Аднаўленне ў дэталях усёй гісторыі бабруйскай крэпасці, удакладненне фактаў прабывання ў ёй дзекабрыстаў прадстаўляе вялікую цікавасць не толькі для гісторыкаў, але і для пісьменнікаў — у справе стварэння вялікіх літаратурных палотнаў аб гераічным мінулым Совецкай Беларусі.

Шмат каштоўных помнікаў старажытнасці на Барысаўшчыне. напрыклад, у вёсцы Студзёнкі (зараз калгас «Чырвоныя Студзёнкі»), дзе ў 1812 годзе пацярпеў канчатковае паражэнне ад рускіх войск Напалеон І. Чычагоўскія бастыёны ў тым-жа Барысаве. Помнік бітвы са шведамі ля вёскі Лясная ў Прапойскім раёне. Пётр І назваў гэту бітву «маццерай Палтаўскага сражэння».

Шмат у нас каштоўных архітэктурных пабудоў, якія заслугоўваюць увагі і вывучэння.

Але звернемся зноў да гісторыі. Мала хто ведае, што ў Мінску ёсць домік (ён і па сёнешні дзень захаваўся), дзе спыняўся Пётр І. Захаваліся ў Мінску (каля высахшай Нямігі) паселішчы старога тыпу. Велізарную навуковую і мастацкую цікавасць прадстаўляюць роспісы на будынках. А колькі цікавых помнікаў мінулага ёсць у заходніх абласцях БССР!

Не мала братніх магіл герояў рассыпана ў розных месцах рэспублікі — у Мінску, Бабруйску, Барысаве, Магілеве. Над магіламі некаторых хутка будуць устаноўлены помнікі. Але гэтага мала для ўвекавечання памяці герояў. Гісторыкі нашы і пісьменнікі павінны расказаць маладому пакаленню аб гераічна загінуўшых сынах рэволюцыйнага народа.

У Беларусі працаваў Л. М. Кагановіч. Гомель і Магілеў захавалі будынкі, дзе Лазар Майсеевіч жыў і выступаў з гарачымі прамовамі. Серго Орджанікідзе прайшоў з 16-й арміяй слаўны шлях ад Магілева да Прыяміна і Барысава.

Фрунзе ў Мінску, прыезд Сталіна на Заходні фронт, агітпоезд «Кастрычніцкая рэволюцыя», у якім прыязджаў у Мінск і Бабруйск М. І. Калінін, прыезды К. Е. Варашылава ў сталіцу БССР, — усё гэта выдатныя гістарычныя факты, патрабуючыя глыбокага вывучэння.

Упраўленне па справах мастацтваў пры Соўнаркоме БССР правяло вельмі значную работу па перапісу помнікаў рэволюцыйнага руху, мастацтва, архітэктуры. Задача нашых пісьменнікаў мастацкім словам расказаць аб героях, аб гераічным мінулым нашай радзімы.

Еф. САДОЎСКІ.

ЗБОРНІК НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ ДЛЯ ШКОЛ

Днямі ў Дзяржаўным выдавецтве БССР выходзіць з друку падрыхтаваная С. І. Васілёнкам кніга «Народная творчасць». Кніга з'явіцца каштоўным дапаможнікам для выкладчыкаў літаратуры ў сярэдніх школах.

Рэдагаваў зборнік акадэмік Ю. М. Сокалаў.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394 Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Р—1033.